

Карэспандэнты «Звязды» наведалі мінскія каткі і вызначылі, дзе катацца найбольш танна, дзе найбольш зручны расклад, а дзе можна сустрэць самадзейную хакейную каманду. СТАР 3



Жыхары вёскі Заручча Бярозаўскага раёна Зоя і Валерый Барысюкі аднойчы прачнуліся знакамітымі. Спачатку ролікі артыстаў з'явіліся на «Шансон ТБ», потым іх паказалі ў вячэрнім эфіры АНТ. СТАР 6



Здараецца, што морква, захоўваючы свой свежы выгляд, на смак гаркаватая. Гэта з-за таго, што падчас росту верхавіны караняплодаў агаліліся і на святле пазелянелі. СТАР 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 СТУДЗЕНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 9 (27374) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ ЎЗНАГАРОДЖАНЫ ПРАДСТАЎНІКІ МЕДЫЦЫНЫ, КУЛЬТУРЫ І СІЛАВЫХ СТРУКТУР

**Адпаведныя ўказы аб узнагароджванні дзяржаўнымі ўзнагародамі і распараджэнне аб аб'яўленні падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 16 студзеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Ордэнамі Айчыны III ступені, «За службу Радзіме» III ступені, медалямі «За адвагу», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», «За бездакорную службу» I, II і III ступені ўзнагароджаны прадстаўнікі МУС, МНС, Міністэрства абароны, Дзяржпагранкамітэта і Следчага камітэта.

У прыватнасці, за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў медалём «За бездакорную службу» I ступені ўзнагароджаны намеснік начальніка дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай установы «Авіяцыя» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Аляксей Есіповіч, аператыўны дзяжурны аддзела кіравання сіламі і сродкамі Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Сяргей Паравой, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Васіль Чакан.

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» — галоўны ўрач Кіраўскай цэнтральнай раённай бальніцы Алена Круцько, загадчык аддзела даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання Нацыянальнай бібліятэкі Таццяна Яроха, начальнік аддзела эксплуатацыі ААТ «Гомельтранснафта Дружба» Міхаіл Семянцоў.

Медаля Францыска Скарыны, у прыватнасці, удастоены намеснік дырэктара па творчай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Валянціна Кандрацьева, загадчык неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Сяргей Ліхачоў, артыст вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Вераніка Пляшкевіч.

Ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» прысвоена вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Аксане Лясной, ганаровае званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» — выкладчыку Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Эдуарду Кучынскаму, ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» — дырэктару Нацыянальнай бібліятэкі Раману Матульскаму, бібліёграфу першай катэгорыі сектара абслугоўвання Нацыянальнай бібліятэкі Таццяне Рошчынай. Ганаровае званне «Заслужаны работнік фізкультуры і спорту Рэспублікі Беларусь» прысвоена дацэнту кафедры прафесійна-прыкладной фізпадрыхтоўкі Акадэміі МУС Антону Новіку.

Сярод тых, каму аб'яўлена падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — начальнік Бабруйскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Валерый Глушко, дзяржінспектар Пінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Супраненка.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена таксама намесніку галоўнага рэдактара газеты «Белорусская нива» Анжаліцы Мільто.

## ГЛЫБОЦКІ «БУТЭРБРОД»

**У Міністэрстве культуры Беларусі адбылася прэзентацыя дзвюх тэхналогій прыгатавання традыцыйных страў — «Маслянага барана» і выпечкі жытняга хлеба.**





**Гэтыя традыцыі не толькі захавалі, але і працягваюць прымяняць у побыце жыхаркі Глыбоцкага раёна Тэрэса Струй з дачкой Марынай Хрол з вёскі Мацюкова і Сцепаніда Лупач з вёскі Дзеркаўшчына. Спачатку глыбоцкімі майстрыхамі зацікавіліся работнікі культуры раёна і, зафіксаваўшы на фота і відэа працэсы прыгатавання, звярнуліся ў Рэспубліканскую навукова-метадычную раду па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны аб наданні гэтым тэхналогіям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Начальнік аддзела культуры Глыбоцкага райвыканкама Таццяна Малатоўнік (на фота злева) і спецыяліст метадычнага аддзела Наталля Нікіфаровіч (на фота справа) прывезлі на разгляд камісіі перададзеныя майстрыхамі вырабы некалькі відаў і розных формаў хлеба, прыгатаванага ў вясковай печы. У адным з хлябоў нават запечана сала. І двух прыгожых масляных баранчыкаў, зробленых уручную з дапамогаю звычайнай марлі.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

### ЛІЧБА ДНЯ

**120,4%**

склалі, паводле аператыўных даных, рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва краіны ў студзені-лістападзе 2012 года да ўзроўню студзеня-лістапада папярэдняга года. Рэальная заработная плата работнікаў рэспублікі (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені-лістападзе 2012 года склала 120,6% да студзеня-лістапада папярэдняга года. Па папярэдніх статыстычных дадзеных, намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені-лістападзе 2012 года склала Br3 млн 649,7 тыс., павялічыўшыся на 98,2%. Сярэдні заробак у лістападзе мінулага года дасягнуў Br4 млн 244,3 тыс. — 173,9% да лістапада 2011 года.

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 4° |
| Віцебск | – 7° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | – 6° |
| Магілёў | – 4° |
| Мінск | – 6° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.01.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8650,00 ▼ |
| Еўра | 11490,00 ▼ |
| Рас. руб. | 285,00 ▼ |
| Укр. грыўня | 1062,39 ▼ |

■ На слыху

## ЧАКАЦЬ ПАВЫШЭННЯ ЗАРОБКАЎ ПЕДАГОГАМ ЗАСТАЛОСЯ НЯДОЎГА?

**«Да пачатку наступнага навучальнага года настаўнікі павінны адчуць на сабе павышэнне заробкаў», — заявіў учора журналістам на брыфінгу міністр адукацыі Сяргей Маскевіч.**

Варта нагадаць, што падчас апошняй прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ кіраўнік нашай дзяржавы канстатаваў: настаўнікі павінны атрымліваць годную заработную плату і эфектыўна працаваць.

— Выдаткі на адукацыю дасягаюць у Беларусі 6% ад унутранага валавога прадукту. І гэта вельмі высокі паказчык... Ва ўсялякім выпадку, на прасторах СНД большымі выдаткамі не можа пахваліцца ніводная краіна. Іншая справа, як мы гэтымі сродкамі распараджаемся? У нас ёсць шмат пытанняў наконт эфектыўнасці функцыянавання ўсёй сістэмы адукацыі, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Прэзідэнт папярэдзіў, што нам давядзецца прымаць непапулярныя меры. Адзін з кірункаў павышэння эфектыўнасці адукацыйнай галіны і стварэння фонду для павышэння заробкаў педагогам — аптымізацыя сеткі навучальных устаноў. Педагогі павінны зразумець, што мы не можам захоўваць малакамплектныя школы, дзе ў класе ўсяго па некалькі вучняў. Такія школы трэба закрываць і ісці шляхам стварэння для дзяцей добрых умоў для навучання. Да наступнага навучальнага года плануецца закрыць каля 100 школ. Яшчэ адзін рэзерв — гэта павышэнне напаўняльнасці класаў. У адпаведнасці з Кодэксам «Аб адукацыі», максімальная напаўняльнасць класаў складае зараз 25 чалавек. Але на самой справе сярэдняя напаўняльнасць класаў не перавышае 20 чалавек, нават у гарадскіх школах яна складае 21-22 чалавекі. Мы не збіраемся пераглядаць устаноўлены Кодэксам нарматыў, але будзем думаць над тым, каб змяншаць колькасць класа-камплектаў. Трэба, каб у класе было не 16 ці 19 вучняў, а менавіта 25. Будзем арыентаваць на выкананне паказчыка абласныя і гарадскія органы кіравання адукацыяй. Пры наборы навучэнцаў у першыя, пятыя і дзясятыя класы, гэта значыць, калі фарміруюцца новыя класы, гэтая лічба павінна выконвацца.

— Цяпер суадносіны колькасці вучняў і колькасці настаўнікаў складаюць восем да аднаго, а ў савецкай школе былі дзесяць да аднаго, — падкрэсліў міністр. — Ні на постсавецкай прасторы, ні ў Еўропе такіх суадносін няма. У агульнаадукацыйных установах у нас працуе 121 тысяча настаўнікаў. Але калі па адных кірунках назіраецца залішак педагагічных кадраў, то па іншых, наадварот, адчуваецца іх дэфіцыт: для прыкладу, агульнаадукацыйным установам не хапае дэфектолагаў, настаўнікаў фізікі, матэматыкі... З улікам гэтай сітуацыі будуць прымацца рашэнні аб скарачэнні падрыхтоўкі на педагагічных спецыяльнасцях па тых ці іншых кірунках.

Сяргей Маскевіч паведаміў таксама, што Міністэрствам адукацыі вывучалася пытанне аб павелічэнні нагрузкі на настаўнікаў з 18 да 20 гадзін у тыдзень:

— Мы раіліся з педагагічнай грамадскасцю, з галіновым прафсаюзам, вывучалі досвед нашых суседзяў, але дастаткова аргументаў для павелічэння нагрузкі пакуль не знайшлі.

Цяпер сярэдняя заработная плата школьнага настаўніка складае 3,5 мільёна рублёў пры сярэдняй нагрузцы 23 гадзіны. Але ў педагогаў дашкольных устаноў адукацыі заробкі выглядаюць яшчэ больш сціпла: яны вар'іруюцца ад 2,1 да 2,5 мільёна рублёў.

— Мы падрыхтавалі і ўзгаднілі з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Міністэрствам фінансаў свае прапановы па аплаце працы работнікаў дашкольных устаноў. І зараз яны ўнесены на разгляд ва ўрад. У тым выпадку, калі нашы прапановы будуць падтрыманы, павышэнне заробкаў у сістэме дашкольнай адукацыі складзе не 5%, і не 10%, а нашмат больш, — запэўніў міністр.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Уласны кашалёк

## ПАДЛІЧЫЦЬ ДАХОДЫ ЗА ГОД І ПАДАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ ТРЭБА ДА 1 САКАВІКА

**Пэўная частка падаткаплацельшчыкаў нашай краіны павінна сёлета да першых дзён сакавіка падаць у падатковыя органы дэкларацыю аб даходах за мінулы год. Тут трэба адразу адзначыць, што далёка не ўсе работнікі з вялікімі заробкамі абавязаны наведваць падатковую інспекцыю. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе.**

### ДЭКЛАРАВАЦЬ ПРОДАЖ НЕКАЛЬКІХ АБ'ЕКТАЎ НЕРУХОМАСЦІ

Не пазней за 1 сакавіка абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя людзі, што на працягу 5 гадоў прадалі іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом (гараж, зямельны ўчастак, садовы домік, дачу ці іншую нерухомую маёмасць). За даходы ад продажу такой маёмасці неабходна будзе заплаціць падаткі ў бюджэт.

Падаюць дэкларацыю па выніках года і тыя падаткаплацельшчыкі, хто летась прадаў грузавік, аўтобус або другую легкавую машыну; пасля рэалізацыі каштоўных папер, маёмасных правоў, доляў ці паёў у арганізацыях.

### ДАХОДЫ З-ЗА МЯЖЫ

Спецыялісты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.

Запаўняць падагульняючую дэкларацыю будуць тыя, хто атрымаў даходы ад фізічных асоб, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у выглядзе дарэння і (або) нерухомай маёмасці па дамовах рэнты бязвыплатна пры ўмове, што такія даходы ў агульнай суме за мінулы год перавысілі 500 базавых велічынь (50 мільёнаў рублёў).

Вядома, што пры здачы кватэр гаспадары жылля плацяць штомесяц фіксаваную стаўку падаходнага падатку, аднак... Па выніках года дэкларуюцца даходы, што былі атрыманы ад здачы ў арэну (субарэнду), наём (падаём) грамадзянам жылых і нежылых памяшканняў, калі даход за год склаў больш за 50 мільёнаў рублёў.

Дэклараваць свае даходы, што ў агульнай суме больш як 100 мільёнаў рублёў за год, павінны цяпер інваліды, непаўналетнія, тыя, хто не мае бацькоў ці мае патрэбу ў дарагой медыцынскай дапамозе і атрымалі яе ў якасці спонсарскай дапамогі ад беларускіх арганізацый і грамадзян краіны.

Наведаць падатковую інспекцыю трэба будзе і тым грамадзянам, якія вярнулі ўзносы (у тым ліку праіндэксаваныя) пасля спынення будаўніцтва кватэр ці індывідуальных жылых дамоў або ў выпадку патаннення будаўніцтва, а таксама тады, калі чалавек выбывае з членаў арганізацый забудоўшчыкаў да заканчэння будаўніцтва жылога дома. СТАР 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЫБУХ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ АЛЕПА Ў ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ ЗАБРАЎ 82 ЖЫЦЦІ



У будынак Універсітэта Алепа, які знаходзіцца на тэрыторыі аднайменнага горада на поўначы Сірыі, трапілі дзве ракеты. Загінулі 82 чалавекі, 160 атрымалі раненні, паведамілі інфармагенцтвы са спасылкай на сірыйскія СМІ. Першапачаткова паведамлялася пра 15 загінулых. Ракеты трапілі ў будынак факультэта тэхнічнай інфармацыі.

### У МАСКВЕ ЗАСТРЭЛЕНЫ САМЫ ВЯДОМЫ КРЫМІНАЛЬНЫ «АЎТАРЫТЭТ»

У самым цэнтры Масквы ўчора днём забіты злодзей у законе Аслан Усаян, больш вядомы як Дзед Хасан. «На Кухарскай вуліцы здзейснены замах на Аслана Усаяна. Ён быў паранены і дастаўлены ў бальніцу», — распавялі ў праваахоўных органах. Ад раненняў у галаву мужчына памёр у прыёмным аддзяленні. У сваю чаргу, крыніца ў праваахоўных органах паведаміла, што ва Усаяна стрэліў невядомы, калі той выходзіў з рэстарана. «У яго стралялі са снайперскай вінтоўкі некалькі разоў», — удакладніла крыніца. У нагу была паранена выпадковая відавочца — 30-гадовая жанчына. Па словах крыніцы, сярод версій забойства — крымінальныя разборкі. Гэта ўжо другі замах на Усаяна за апошнія некалькі гадоў. 73-гадовы ўраджэнец Грузіі Усаян лічыўся адным з самых уплывовых зладзеяў у законе, якія дзейнічалі ў Расіі ў апошнія два дзесяцігоддзі.

### ЯГАДЫ АБАРАНЯЮЦЬ СЭРЦА

Ягады, багатыя на карысныя флаваноіды, як і цёмны шакалад, вінаград, чырвонае віно, баклажаны, прадухіляюць хваробы сэрца, дапамагаючы пашыраць сасуды і не даюць назапашвацца ў іх адкладам, піша The Telegraph. Як паказала назіранне, жанчыны, якія спажывалі больш за ўсё дурніц і клубніц, знізілі тым самым рызыку сардэчнага прыступу на 32% у параўнанні з людзьмі, якія елі ягады раз у месяц ці радзей. Прычым у цэлым рацыён не адыгрываў ніякай ролі. Было даказана, што ўзрост, наяўнасць высокага ціску, выпадкі сардэчных прыступаў у сям'і жанчыны, вага, рэжым трэніровак, курэнне, спажыванне кафеіну або алкаголю на гэта не ўплываюць. Аказалася, што нават у маладым узросце актыўнае спажыванне ягад аказвала пазітыўны эфект на здароўе ў далейшым.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### УКРАІНА СПРАШЧАЕ ПРАЦЭДУРУ ЎСЫНАЎЛЕННЯ ЗАМЕЖНІКАМІ

**Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч унёс у Вярхоўную Раду законапраект аб ратыфікацыі Канвенцыі аб абароне дзяцей і супрацоўніцтве па пытаннях міжнароднага ўсынаўлення.**

Гаворка ідзе пра дакумент, які быў прыняты 29 мая 1993 года ў Гаазе. Яго ўдзельнікамі ў цяперашні час з'яўляюцца 89 дзяржаў. У сувязі з далучэннем Украіны да Канвенцыі Януковіч прапануе ўнесці шэраг змяненняў у заканадаўства рэспублікі. У прыватнасці, пераважнае права ўсынаўлення сярод замежнікаў атрымаюць грамадзяне краін — членаў Канвенцыі, дзяржаў, з якімі раней былі падпісаны адпаведныя дамовы, а таксама сваякі саміх дзяцей. Згодна з дзейным законам, першачарговае права на ўсынаўленне (сярод іншаземцаў) маюць сваякі дзіцяці і грамадзяне дзяржаў, з якімі Украіна заключыла дамову аб прадастаўленні прававой дапамогі.

КОРАТКА

У канцы першага квартала ў Беларусі запусцяць камерцыйнае лічбавае эфірнае тэлевяшчанне. На звычайную антэну можна будзе прымаць 28 каналаў у дадатак да 7 якія ўжо трансліююцца.

Апынуцца ў тропіках і палюбавацца «жывымі кветкамі» запрашае Музей гісторыі Мінска. Тут будзе прадстаўлена некалькі дзясяткаў відаў матылькоў з Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыкі, Аўстраліі, Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыкі. Экспазіцыя адкрываецца 18 студзеня і прадоўжыцца да красавіка.

У Беларусі падаражэлі некаторыя антыінфекцыйныя, сардэчныя і проціпухлінныя прэпараты. Гранічныя максімальныя адпускныя цэны павышаны на лекавыя сродкі, якія вырабляюцца рэспубліканскімі вытворчымі ўнітарнымі прадпрыемствамі «Акадэмфарм», «Белмедпрэпараты» і сумесным таварыствам з абмежаванай адказнасцю «Лекфарм». Павышэнне склала ад 6 да 20 працэнтаў.

## ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ДЛЯ ТАГО, КАБ МАГІЛЁЎ СТАЎ САПРАЎДНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СТАЛІЦАЙ?



**Алена МАЦЯРЫНКА, спявачка, лаўрэат міжнародных конкурсаў, выкладчык вакалу:**

— Мне падаецца, што ўжо шмат зроблена. У нас праводзіцца шмат фестываляў, на якія прыязджаюць вядомыя артысты з блізкага і далёкага замежжа. Музеі — гордасць Магілёва. У нас ёсць гістарычныя помнікі, прыгожыя праваслаўныя і каталіцкія храмы. Можа, толькі мы надта сціпла паводзім сябе і не хвалімся гучна пра свае культурныя здабыткі? Што датычыцца матэрыяльных рэчаў, то мне, як спявачцы, і маім калегам не хапае новай канцэртнай залы, вялікай і сучаснай, з добрай акустыкай. У нашых залах, калі прыязджаюць «Віртуозы Масквы» і аркестр Юрыя Башмета, не хапае месцаў для ўсіх аматараў музыкі. Спартыўныя аб'екты ў нас актыўна будуюцца, трэба ўзгадаць і пра культуру.



**Андрэй НОВІКАЎ, дырэктар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра:**

— Трэба змяніць стаўленне ўсіх жыхароў Магілёва да саміх сябе. Як гэта? Ну хаця б перастаць пляваць пад ногі, прабачце за такую адкрытасць! Гэта павінна быць доўгая, вялікая, сістэматычная праца па культурным выхаванні людзей, якая робіцца ў нас і абавязкова дасць вынікі. Яна ўключае ў сябе мноства мерапрыемстваў, правядзенне фестываляў і канцэртаў, адкрыццё музейных экспазіцый. Што датычыцца мастацкага густу, то давайце будзем шчырымі і прызнаем, што наўрад ці ўсе скрозь будуць з захапленнем ставіцца да артхаўснага кіно і абмяркоўваць тонкасці рэжысёрскай працы Ларса фон Трыера. Але жыхары культурнай сталіцы як мінімум не павінны кідаць смецце на вуліцах і рабіць надпісы на сценах. Ну як можна было сапсаваць скульптуру каля нашага тэатра — адарваць парасон ад дамы з сабачкам? У нас увесну ў Магілёве адкрыецца традыцыйны тэатральны форум «Марктантакт». Хочацца, каб госці культурнай сталіцы ўбачылі прыгожы горад і добрых людзей.



**Ірына БАРДЗІЛОЎСКАЯ, рэдактар студыі тэлебачання тэлерадыёкампаніі «Магілёў», вядучая гарадской праграмы «Дзеці асфальту»:**

— Каб стаць больш культурнымі людзьмі, трэба найперш быць больш добрымі адно да аднаго. Трэба адмятаць негатыў, не грубіць і не лаяцца, а канцэнтравацца на станоўчых эмоцыях, быць ветлівымі штодня і ўсюды. А так у Магілёве ёсць усё, каб звацца культурнай сталіцай. Горад дастойны, каб пра яго даведаліся ў замежжы. У нас шмат устаноў, дзе далучыцца да культурнага жыцця могуць і дарослыя, і дзеці. У нас цудоўныя тэатры. У музеі гісторыі Магілёва набываюць з дапамогай неабыякавых магілёўцаў старажытныя каштоўныя кнігі. На канцэртах можна бясконца здзіўляцца высокаму прафесіяналізму мастацкіх калектываў, якія, аднак, самадзейныя! Але гараджане, як заўсёды, мітусяцца, спяшаюцца па справах і ў большасці не заўважаюць культурнага жыцця навокал. Трэба ўзгадаць, што ёсць субота і нядзеля для культпаходаў і самаразвіцця. Трэба выхоўваць культуру ў сябе і вывучаць даступнае нам культурнае багацце.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**

■ Па той бок прылаўка

# ГАНДЛЁВЫМ СЕТКАМ АБМЯЖУЮЦЬ АПЕТЫТЫ?

**Міністэрства гандлю адсочвае развіццё гандлёвых сетак у розных гарадах Беларусі і прапануе заканадаўча замацаваць за сабой паўнамоцтвы па абмежаванні іх прысутнасці ў гандлі. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік міністра гандлю Вячаслаў ДРАГУН падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**



— Мы ўнеслі прапанову аб прадастаўленні нашаму міністэрству такога права, але пакуль у нас няма падстаў для падобных дзеянняў, бо на заканадаўчым узроўні гэта не вырашана. Міністэрства зможа абмяжоўваць прысутнасць пэўных сетак у выпадку, калі іх доля на рынку будзе перавышаць 30%, — адзначыў намеснік міністра.

Па яго словах, зараз працягваецца развіццё буйных гандлёвых сетак, якія з абласных гарадоў і сталіцы пачынаюць прыходзіць у раённыя цэнтры, і робяць яны гэта дастаткова актыўна. За апошні год той жа «Еўраопт» адкрыў 25 новых магазінаў у розных рэгіёнах краіны. У невялікіх населеных пунктах шмат дробных крам, якія існуюць ужо даўно, і прыход буйных канкурэнтаў, вядома, абцяжарвае ім працу.

Аналіз спажывецкага рынку, які быў праведзены Міністэрствам гандлю, можа расказаць пра ўплыў сеткавых кампаній на той ці іншы рэгіён. У цэлым па краіне іх доля не перавышае 20%, але калі разглядаць кожны выпадак асобна, то лічбы самыя розныя. Напрыклад, у асобных раёнах Мінскай вобласці прысутнасць крам сеткі «Еўраопта» ў агульнай гандлёвай «карціне» складае ад 1,5% да 27%.

Што датычыцца новых замежных інвестыцый у беларускі гандаль, то, па словах намесніка міністра, на 2013 год ужо ёсць пэўны спіс інвестыцыйных праектаў па стварэнні новых гандлёвых аб'ектаў. Вячаслаў Драгун таксама адзначыў, што ўсе яны хочуць прыйсці ў сталіцу, дзе найбольшы паток пакупнікоў, але варта намагацца размяшчаць іх рацыянальна. Агучыць спіс патэнцыйных інвестараў прадстаўнік Міністэрства гандлю адмовіўся, бо пакуль невядома, ці прымуць яны канчатковае рашэнне аб супрацоўніцтве.

На думку намесніка міністра, беларускі гандаль павінен цалкам адмовіцца ад кіёскаў. Яны павінны паступова знікнуць, паколькі ў гэтых аб'ектах гандлю няма адпаведных умоў ні для работы людзей, ні для захоўвання і рэалізацыі тавараў. «Гэта не зусім правільна, гандляваць так, калі ёсць адпаведныя гандлёвыя плошчы, дзе створаны ўсе неабходныя ўмовы», — адзначыў Вячаслаў Драгун.

Першым ад кіёскаў адмовіўся Мінск. Услед за сталіцай ад кіёскаў адмаўляюцца і рэгіёны — там, паводле яго слоў, вядзецца планамерная работа. «Індывідуальным прадпрымальнікам прапануецца перавод у добраўпарадкаваныя памяшканні. Гэта работа вядзецца і па гарадах, і па асобных групах тавараў», — сказаў намеснік міністра.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■

# ПАДЛІЧЫЦЬ ДАХОДЫ ЗА ГОД І ПАДАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ ТРЭБА ДА 1 САКАВІКА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Дэклараваць такія даходы трэба ў сувязі з тым, што на такія ўзносы распаўсюджваўся прынцып маёмаснага падатковага выліку, звязанага з будаўніцтвам ці набыццём жылля. Дэклараваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі з ліку арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.

## ЗАПАЎНЯЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ ЛЕПШ У ІНСПЕКЦЫІ

Непасрэдна дэкларацыю аб даходах за мінулы год падаюць у падатковы орган асабіста ці праз прадстаўніка. Магчыма накіроўваць такі дакумент у інспекцыю па пошце і ў электронным выглядзе.

Разам з тым, спецыялісты МПЗ адзначаюць, што ў дэкларацыях, дасланых па пошце, часам сустракаецца даволі шмат памылак, якія хутка выправіць немагчыма. Таму падаткаплацельшчыку лепш самастойна наведаць інспекцыю і атрымаць там кваліфікаваную кансультацыю ад спецыяліста.

Тут трэба адразу нагадаць, што бліжэй да «часу пік» у падатковых інспекцыях могуць назірацца вялікія чэргі, а вось да трэцяй дэкады лютага там пакуль свабодна. Цяпер прыём дэкларацый ажыццяўляецца падатковымі органамі па агульным графіку з 8.00 да 19.00 у працоўныя дні. Магчыма, што ў лютым інспекцыі будуць працаваць па лініі дэкларавання і па суботах.

## МОЖНА АТРЫМАЦЬ ПАДАТКОВЫЯ ВЫЛІКІ

Калі чалавек пераплаціў падаходныя падаткі за мінулы год, то праз інспекцыі гэтыя грошы ён можа яшчэ вярнуць.

У гэтым выпадку дэкларацыю аб даходах за год падаюць тыя грамадзяне, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў (сацыяльных, маёмасных і прафесійных), пры ўмове, што абавязак па прадастаўленні такіх вылікаў грамадзянам ускладзены на падатковыя органы. Увогуле ўзор формы падатковай дэкларацыі аб даходах за год можна знайсці на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах (www.nalog.gov.by).

## ПРАДУГЛЕДЖАНА АДКАЗНАСЦЬ

У тым выпадку, калі грамадзянін, які абавязаны быў гэта зрабіць, забыўся ці вырашыў не падаваць дэкларацыю, то ён атрымае штраф — 2 базавыя велічыні (зараз гэта 200 тысяч рублёў) плюс па 0,5 базавай за кожны месяц пратэрміноўкі. Аднак потым і падаткі неабходна будзе заплаціць напоўніцу.

Дарэчы, калі дэкларацыю аб даходах за мінулы год неабходна падаваць да 1 сакавіка, то заплаціць падаткі ў бюджэт неабходна будзе да 15 мая.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# КОЛЬКАСЦЬ ПРАВЕРАК ЗНІЗІЦЦА НА 20%

**Аб гэтым заявіла падчас анлайн-канферэнцыі, якую правяло БЕЛТА, начальнік аддзела каардынацыі дзейнасці кантралюючых (наглядных) органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Данута РЫЖЫКАВА.**

У першым паўгоддзі 2013 года, у параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года, планавых праверак будзе менш на 20,1%. Гэта звязана з уступленнем у сілу патрабаванняў Указа № 332 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні кантрольнай дзейнасці ў Беларусі». Згодна з дакументам, з 1 кастрычніка мінулага года добрасумленных суб'ектаў гаспадарання ў планавым парадку правяраць можна не часцей за адзін раз у 5 гадоў.

**У сувязі з новаўвядзеннем, Кучко Мікалай Іванавіч з Маладзечна пацікавіўся:** ***«Ці не баіцца КДК, што пры лібералізацыі кантролю і нагляду могуць распладзіцца парушальнікі закону? Маўляў, вось іх правераць, і пасля 5 гадоў ніхто не будзе чапаць, а за гэты час можна ж і парушыць нешта»...***

— Пяць гадоў — гэта перыядычнасць прызначэння планавых праверак для суб'ектаў, аднесеных да нізкай групы рызыкі, і для так званых добрасумленных суб'ектаў, — тлумачыць **намеснік начальніка ўпраўлення падрыхтоўкі і экспертызы праектаў заканадаўчых актаў КДК Таццяна ЧУХЛЕЙ.** — Згодна з указам, суб'ект атрымлівае статус добрасумленнага, калі ў яго пры папярэдняй праверцы не ўстаноўлены парушэнні заканадаўства. Калі ж на працягу 5 гадоў пасля папярэдняй праверкі ў якога-небудзь кантралюючага органа з'яўляюцца дакладныя звесткі аб тым, што добрасумленны суб'ект здзейсніў правапарушэнне, то ў дачыненні да яго можа быць прызначана пазапланавая праверка. Тое ж самае тычыцца і тых суб'ектаў, якія адносяцца да нізкай групы рызыкі.

Паводле слоў Рыжыкавай, з прыняццем Указа № 332, у кантрольнай рабоце рэзка ўзрасла роля аналітычнай работы падчас прызначэння праверак. «Перш чым запланаваць праверку, кантралюючы і наглядны орган абавязаны ўсебакова вывучыць суб'ект, які мяркуецца праверыць. Кантралёры не ідуць на праверку толькі дзеля праверкі. У іх, як правіла, ужо ёсць нейкая вызначаная інфармацыя аб невыкананні суб'ектам гаспадарання нейкага заканадаўчага акта».

Разам з тым скарацілася не толькі колькасць праверак, але і колькасць кантралюючых органаў. Так, страцілі права кантролю за дзейнасцю суб'ектаў гаспадарання асобныя камерцыйныя арганізацыі, якія раней вялі такую дзейнасць, структурныя падраздзяленні без права юрыдычнай асобы (яны не могуць самастойна прызначыць такую праверку)...

— І гэтая работа яшчэ не завершана, — адзначыла Данута Рыжыкава. — Указам даручана Савету Міністраў разам з аблвыканкамамі перагледзець функцыі кантралюючых і наглядных органаў, таму мы чакаем далейшага іх скарачэння.

**Аляксандр Сыцько з Гродна запытаўся:** ***«Ці можна напісаць заяву для правядзення пазапланавай праверкі сваёй арганізацыі? Калі падчас такой праверкі будуць выяўлены парушэнні, ці прыменяць у дачыненні да арганізацыі якія-небудзь санкцыі?»***

Паводле слоў Таццяны Чухлей, па заяве суб'екта гаспадарання можа быць прызначана пазапланавая праверка. Праўда, меры адказнасці, калі знойдуць парушэнні, будуць прымяняцца, і ніякіх выключэнняў тут няма. Лепш звярнуцца ў кантралюючыя органы з просьбай аб правядзенні маніторынгу. У гэтым выпадку меры адказнасці спачатку не прымяняюцца, суб'екту прапануецца ліквідаваць парушэнні.

— Мы гатовы дапамагаць суб'ектам у іх дзейнасці ў мэтах прафілактыкі правапарушэнняў, — дадала Данута Рыжыкава. — Да правядзення праверкі рэкамендую звярнуцца ў кантралюючыя органы для кансультацыі, каб, па магчымасці, ліквідаваць парушэнні. Асабліва калі той, каго правяраюць, ведае, што ў арганізацыі нешта зроблена не так.

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Па-суседску

# ЭКАНОМІКА ДЫКТУЕ НЕАБХОДНАСЦЬ ПАЛІТЫЧНАЙ ПЕРАЗАГРУЗКІ

**Тавараабарот паміж Літвой і Беларуссю дасягнуў рэкордных паказчыкаў. Але гэта не мяжа. Такая думка гучала на сустрэчы беларускага пасла з прадстаўнікамі літоўскіх дзелавых колаў.**

Кожны новы год пачынаецца не толькі паднятым бакалам шампанскага, але і падвядзеннем вынікаў года мінулага. 2012-ы быў для беларуска-літоўскіх эканамічных адносін асаблівым. «За мінулае дзесяцігоддзе 2012-ы быў самым паспяховым у гандлёвых і эканамічных адносінах паміж Беларуссю і Літвой, — сказаў карэспандэнту «Звязды» **пасол Беларусі ў Літве Уладзімір ДРАЖЫН**. — Упершыню гадавы тавараабарот паміж дзвюма краінамі перавысіць $1,5 млрд. Для параўнання, шэсць гадоў таму ён быў у чатыры разы меншы».

Тавараабарот паміж дзвюма краінамі, нягледзячы на тое, што ў сферы палітыкі не ўсё было бязвоблачна, рос няўхільна. У 2009 годзе ён склаў $565,6 млн, 2010 годзе — $698,8 млн, у 2011 годзе дасягнуў $1 млрд, а ў мінулым годзе пераваліў за $1,5 мільярда. Літва і Беларусь сталі адна для адной важнымі эканамічнымі партнёрамі.

У наменклатуры беларускага экспарту Літву 60% складаюць прамежкавыя тавары, 17—20% — сыравінны экспарт, 20—23% — гатовая прадукцыя, харчовыя тавары і тавары народнага спажывання. У разрэзе галіновых міністэрстваў і канцэрнаў Беларусі найбольшую долю ў экспарце займае прадукцыя прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім» і Міністэрства прамысловасці — прыкладна па 20%.

Асноўнымі экспартнымі пазіцыямі ў Літву з'яўляюцца нафтапрадукты, вырабы металургіі, угнаенні мінеральныя, калійныя і азотныя, трактары, электраэнергія, алей рапсавы, лесаматэрыялы, шыны, ніткі сінтэтычныя, садавіна замарожаная, торф і драўніна паліўная. З'явіліся новыя экспартныя пазіцыі: дарожная і будаўнічая тэхніка, аўтапагрузчыкі, кукуруза, пшаніца, шакалад, палімеры прапілену і інш.

У тастарнай структуры імпарту з Літвы пераважаюць вырабы з цэменту і штучнага каменю, арматура для трубаправодаў, фарба друкарская, прадукты для харчавання жывёл, шлакавата, цэмент, нафтапрадукты, адзенне, насосы, кампрэсары, вентылятары, халадзільнікі і халадзільнае абсталяванне, металаканструкцыі з чорных металаў. У выніку, паводле папярэдніх звестак, летась знешні гандаль Беларусі і Літвы ў параўнанні з 2011 годам павялічыўся больш чым на 40%, беларускі экспарт павялічыўся на 47%, імпарт з Літвы — павялічыўся на 21%. У 2012 годзе сальда для Беларусі было станоўчае — каля 780 млн долараў. Другі важны паказчык 2012 года — узровень выкананых паслуг паміж абедзвюма краінамі перавысіў $0,5 млрд. Гэта дасягнута дзякуючы актыўнаму ўдзелу ўсіх суб'ектаў гаспадарання, якія выпрацоўваюць і дастаўляюць тавары (Беларуская і Літоўская чыгункі, аўтамабільныя кампаніі, Клайпедскі марскі порт і інш.).

Паказчыкі рэкордныя, але гэта яшчэ не мяжа. Такая думка неаднаразова была выказана ў Вільнюсе на сустрэчы пасла Беларусі ў Літве Уладзіміра Дражына з уладальнікамі і менеджарамі найбуйнейшых літоўскіх кампаній і холдынгаў, кіраўнікамі Літоўскай чыгункі, Клайпедскага дзяржаўнага марскога порта, Канфедэрацыі прамыславікоў Літвы, вядучых галіновых асацыяцый і транспартна-лагістычных цэнтраў. На ёй у форме канструктыўнага дыялогу былі абмеркаваны перспектывы далейшага супрацоўніцтва Беларусі і Літвы з акцэнтам на запланаваныя сёлета мерапрыемствы.

Усе ўхвалілі ідэю аб правядзенні ў горадзе Друскінінкай IX Міжнароднага беларуска-літоўскага эканамічнага форуму. Гэты фармат сустрэч, які праходзіць з 2005 года пачаргова ў Беларусі і Літве, ужо даказаў свой плённы ўплыў на ўмацаванне дзелавых сувязяў паміж суседзямі. Асабліва эфектыўным быў V літоўска-беларускі эканамічны форум, што адбыўся ў 2009 годзе ў Вільнюсе. У ім узяў удзел і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

На сустрэчы ў пасольстве былі таксама падтрыманы ідэі правядзення ў гэтым годзе II Беларуска-Літоўскага форуму рэгіянальнага супрацоўніцтва, 16-га пасяджэння двухбаковай беларуска-літоўскай камісіі па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве, VII Нацыянальнай выставы «Беларусь ЭКСПА—2013» у Вільнюсе.

Бакі дамовіліся правесці сёлета ў горадзе Магілёве першае сумеснае пасяджэнне беларуска-літоўскага дзелавога савета па эканамічным і гандлёвым супрацоўніцтве, прымеркаваўшы яго да ўрачыстай цырымоніі ўводу ў эксплуатацыю сучаснага дрэваапрацоўчага кластара на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Магілёў», аналагаў якому яшчэ не было ў Беларусі.

— Цяпер мы ажыццяўляем у Беларусі інвестыцыйны праект па будаўніцтве вертыкальна інтэграванага дрэваапрацоўчага комплексу, — патлумачыў «Звяздзе» **ўдзельнік Магілёўскага праекта Сігітас ПАЎЛАЎСКАС, старшыня праўлення закрытага акцыянернага таварыства «MG GROUP», сустаршыня Беларуска-Літоўскага дзелавога савета па эканамічным і гандлёвым супрацоўніцтве.** — Ён будуецца на тэрыторыі СЭЗ «Магілёў». Вытворчасць плануецца запусціць сёлета. Як плануецца, аб'ём інвеставання — 100 млн еўра да 2015 года. Для рэалізацыі праекта выдзелены зямельны ўчастак. Там вырасце вялікі дрэваапрацоўчы комплекс. На камбінаце будуць вырабляць сучасную мэблю — сталы, паліцы, мэблю для спальні і гасцёўні. Сыравіна — беларуская драўніна. Адным з асноўных заказчыкаў прадукцыі камбіната будзе канцэрн IKEA, які займаецца продажам мэблі ў многіх краінах. Будаўніцтвам камбіната ў Беларусі мы хочам умацаваць пазіцыю канцэрна і на ўсходніх рынках, дзе, па меры росту пакупніцкай здольнасці жыхароў, бачым немалы патэнцыял. Беларусь мае добрую сыравінную базу і традыцыі ў гэтай галіне, яе ўваходжанне ў Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам дазволіць рэалізаваць прадукцыю гэтага камбіната і на рынках краін СНД».

**По індэксе лёгкасці вядзення бізнэсу са 183 краін, ахопленых даследаваннем Сусветнага банка «Doing Business-2011», Беларусь за два гады ўзнялася амаль на 50 пазіцый.**



**Летась Клайпедскі марскі порт далучыўся да заявы Літоўскай канфедэрацыі прамыслоўцаў, якая выступіла супраць эканамічных санкцый Еўрасаюза ў дачыненні да Беларусі. Тут абслугоўваецца каля 60% беларускага экспарту, у выніку чаго літоўскі сектар транспартнага транзіту атрымлівае каля 1,7 млрд літаў — такія лічбы прыводзіліся ў заяве прамыслоўцаў. Фота з сайта LITHUANIAN MARITIME FOUNDATION.**

Пра станоўчыя бакі інвестыцыйнага клімату ў Беларусі гаварылі і старшыня Асацыяцыі сцівідорных кампаній, генеральны дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «BEGA» Алоізас Кузмарскіс, прэзідэнт канцэрна «Achema Group» Арунас Лаўрынайціс, генеральны дырэктар Канфедэрацыі прамыславікоў Літвы Гедымінас Райніс, іншыя ўдзельнікі сустрэчы.

Беларусь, удзельнічаючы ў Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы з Расіяй і Казахстанам, практычна становіцца «заходнімі варотамі» для замежнага бізнэсу. Літоўскі інвестар атрымлівае новую і маштабную магчымасць — працаваць на 170-мільённым рынку трох дзяржаў. На гэтай прасторы дзейнічаюць роўныя ўмовы для прадпрыемстваў, забяспечваецца свабоднае перамяшчэнне тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы. Літоўскія бізнэсмены ўхвалілі і шырокія рэформы, якія праводзяцца ў Беларусі, накіраваныя на лібералізацыю эканомікі і павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці краіны. Па індэксе лёгкасці вядзення бізнэсу з 183 краін, ахопленых даследаваннем Сусветнага банка «Doing Business-2011», Беларусь за два гады ўзнялася амаль на 50 пазіцый. Паляпшэнню інвестыцыйнага клімату садзейнічае і дзейнае ў Беларусі пагадненне з Літвой аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання і дагавораў аб ажыццяўленні і абароне інвестыцый.

Літоўскія дзелавыя колы задавальняе і створаная ў суседняй краіне сістэма стымулаў, ільгот і прэферэнцый для ажыццяўлення інвестыцыйнай дзейнасці. Магчыма, таму ў топ-10 краін-донараў прамых замежных інвестыцый у Беларусь у 2012 годзе побач з Расіяй, Вялікабрытаніяй, Украінай, Італіяй, Германіяй, ЗША ёсць і невялікая краіна — Літва.

На мой погляд, умацаванню суседскіх сувязяў паўплывае і змена складу Сейма і ўрада ў Літве. Новы старшыня парламента Літвы Відас Гедвілас заявіў, што адносіны з Беларуссю маюць патрэбу ў «перазагрузцы».

«Трэба перазагружаць адносіны, гэта дакладна, таму што Беларусь — наш самы блізкі сусед (...) Эканамічныя, культурныя, спартыўныя і прадпрымальніцкія адносіны трэба паляпшаць. Ад гэтых адносін залежыць, як будуць жыць у Літве нашы людзі», — сказаў Відас Гедвілас.

Падобным чынам днямі выказаўся і новы міністр замежных спраў Літвы Лінас Лінкявічус. На пытанне аб узаемадзеяннях Літвы з Беларуссю ў мінулым і гэтым годзе, міністр сказаў, што летась адносіны маглі быць і лепшымі. Лінас Лінкявічус падкрэсліў, што «бачыць рэзерв» у стасунках з усходнімі суседзямі. «Можна паспрабаваць ствараць больш канструктыўныя адносіны, аднак да гэтага трэба падыходзіць карпатліва і спакойна. У першую чаргу, хачу падкрэсліць, што не будзем рабіць нічога за кошт інтарэсаў нашай краіны і яе жыхароў. Дыялог павінен быць ветлівым, паважлівым да суразмоўцы. Трэба выслухаць і яго аргументы», — сказаў ён. Міністр дадаў, што «мінулае не можа кіраваць будучым, у адваротным выпадку не будзе прагрэсу. Я спадзяюся, што пойдзем па гэтым шляху».

**Беларусь, удзельнічаючы ў Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы з Расіяй і Казахстанам, практычна становіцца «заходнімі варотамі» для замежнага бізнэсу. Літоўскі інвестар атрымлівае новую і маштабную магчымасць — працаваць на 170-мільённым рынку трох дзяржаў.**

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.**
**Фота аўтара.**

*г. Вільнюс.*



## БЕНЗІН І ДЫЗПАЛІВА ПАДАРАЖЭЛІ

**Канцэрн «Белнафтахім» зацвердзіў новыя адпускныя і рознічныя цэны на нафтапрадукты.**



У краіне з пачатку года гэта першае падаражанне бензіну і дызельнага паліва. Рознічныя цэны на паліва, што рэалізуецца праз АЗС, павялічыліся ў сярэднім на 5 працэнтаў. Яны ўступілі ў сілу з 16 студзеня.

З гэтай даты дзейнічаюць наступныя цэны за адзін літр: на бензін Нармаль-80 — 7,2 тыс. руб., на бензін АІ-92 К3 — 7,3 тыс., на бензін АІ-92 К5 — 7,4 тыс., на бензін АІ-95 — 7,8 тыс., на дызельнае паліва — 8 тыс., на дызельнае паліва Еўра-5 — 8,4 тыс., на дызельнае паліва «Арктыка» — 9,3 тыс. рублёў.

Як патлумачыла прэс-служба канцэрна, перагляд цэн праведзены ў мэтах частковай кампенсацыі росту тарыфаў на чыгуначныя перавозкі па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, павелічэння на 20% ставак акцызаў на нафтапрадукты ў 2013 годзе, а таксама ў мэтах паэтапнага збліжэння цэн на тавары ў краінах Мытнага саюза (па даных на 11 студзеня гэтага года, узровень цэн на нафтапрадукты ў Беларусі быў ніжэй за ўзровень цэн у Расіі на 14-20%).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АМАЛЬ ПАЛОВА ЭКСПАРТУ — У РАСІЮ

**Па выніках працы за студзень—лістапад мінулага года, сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў Гродне склала плюс 100,9 мільёна долараў.**

Гэта забяспечана перш за ўсё дзякуючы росту экспартных паставак хімічнай прадукцыі (поліаміды, ніткі комплексныя сінтэтычныя), а таксама павялічэнню аб'ёмаў рэалізацыі панчошна-шкарпэткавых вырабаў і мэблі. Асноўным для гродзенскіх прадпрыемстваў традыцыйна з'яўляецца рынак Расіі, дзе рэалізавана 47% экспартнай прадукцыі. У краіны Еўрасаюза пастаўлены 23%. Што датычыцца паслуг, то станоўчае сальда дасягнута перш за ўсё за кошт будаўніцтва і транспарту. Попытам у іншаземцаў карыстаюцца таксама паслугі ў камп'ютарнай сферы, адукацыі і ахове здароўя.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ДВАЙНАЯ ЛІКВІДАЦЫЯ

**Супрацоўнікі ўнітарнага прадпрыемства «Жыткавіцкі камунальнік» прыехалі рамантаваць парыў цэнтральнай водаправоднай сеткі халоднай вады — аварыю, у выніку якой без водазабеспячэння засталіся 12 жылых шматкватэрных дамоў, 434 прыватныя, а таксама 2 сярэднія школы, 6 кацельняў, участковая бальніца, яслі-сад і гасцініца ў Тураве Жыткавіцкага раёна.**

Але праз гадзіну пасля пачатку рамонтных работ ад начальніка аддзялення прадпрыемства «Жыткавіцкі камунальнік» да выратавальнікаў паступіла паведамленне пра тое, што гарыць аўтамабіль, які належыць гэтай арганізацыі. Як расказаў прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, у фургоне знаходзіліся два газавыя балоны. Пры транспарціроўцы ў незамацаваным стане адбылася разгерметызацыя аднаго балона. Адначасова ў кузаве тапілася печка-буржуйка. Высокая канцэнтрацыя небяспечнага рэчыва і высокая тэмпература паветра ўнутры кунга і сталі прычынай першай успышкі газу. На момант узгарання ўнутры знаходзіліся двое рабочых, якія хутка выскачылі з машыны, атрымаўшы апёкі цела (24-гадовы — 12%, а 41-гадовы — 25%). Пацярпелыя дастаўлены ва ўчастковую бальніцу Турава. Падчас пажару адбыўся і другі выбух — балона з кіслародам, у выніку чаго металічны фургон і маёмасць усярэдзіне былі знішчаны цалкам. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС прычынай здарэння называюць парушэнне правілаў транспарціроўкі газавага абсталявання.

Дарэчы, парыў водаправода быў ліквідаваны праз 5 гадзін сумеснымі намаганнямі выратавальнікаў і камунальнікаў. Водазабеспячэнне спажыўцоў адноўлена. Прычынай аварыі стала разбурэнне цэласнасці трубы ў выніку старэння металу — тэрмін яе эксплуатацыі складае каля 60 гадоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## «МАЗ» ПАЙШОЎ ПАД ЛЁД...

**Удзень у вёсцы Рубель Столінскага раёна на рацэ Чаква пад лёд праваліўся грузавы аўтамабіль.**

«МАЗ» пад кіраваннем вадзіцеля мясцовага сельскагаспадарчага вытворчага каапinduction кааператыва па незразумелай пакуль прычыне ехаў праз рэчышча ракі. На адлегласці 25-30 метраў ён праваліўся пад лёд. У кабіне грузавіка, акрамя кіроўцы, знаходзіліся два пасажыры — яго брат і знаёмы. У выніку здарэння аўтамабіль цалкам пайшоў пад ваду, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. Глыбіня ракі ў гэтым месцы — 4-5 метраў. Знаёмы братоў паспеў выбрацца з машыны і адзіны застаўся ў жывых. Вадалазная група дастала з кабіны загінулага кіроўцу. Каб дастаць аўтамабіль з вады, была задзейнічана тэхніка МНС, а таксама СВК. На момант падрыхтоўкі матэрыялу работы на месцы здарэння працягваліся...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «ПРЫХАВАЛІ» КАЗУЛЮ... НА ДРЭВЕ

**На тэрыторыі Ляхавіцкага лясніцтва работнікі Тураўскай міжрайінспекцыі знайшлі тушу незаконна здабытай казулі. Браканьеры «прыхавалі» яе на дрэве, мяркуючы, відавочна, у зручны момант вярнуцца па здабычу.**

Дзяржінспектары пачалі пошук і прыкладна за паўкіламетра ад месца знаходкі сустрэлі групу паляўнічых. Тыя мелі дазвол на здабычу толькі пушнога звера. На месца выклікалі следча-аператыўную групу Жыткавіцкага РАУС, якая канфіскавала ў паляўнічых стрэльбы для правядзення экспертызы. Вядзецца разбор.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ФЕМІДУ... УКРАЛІ!

**Мужчына няўдала ўкраў у віцебскай выставачнай галерэі статуэтку сімвала правасуддзя — Феміды. Ён раней неаднаразова прыцягваўся да адказнасці, у асноўным за здзяйсненне дробных крадзяжоў.**

Як расказаў **Дзмітрый ЛУТАЎ, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Віцебскай вобласці,** гэты чалавек, гуляючы па горадзе, зайшоў у выставачную галерэю. Знаходзячыся там, звярнуў увагу на бронзавую статуэтку жанчыны, якая стаяла на падаконніку. Што гэта была за жанчына, як потым прызнаўся падчас следства, ён не ведаў. І толькі следчы «адкрыў тайну», што гэта была Феміда — багіня правасуддзя. Скарыстаўшыся тым, што прадаўцы-кансультанты галерэі былі заняты абслугоўваннем чарговага наведвальніка, злодзей узяў бронзавую Феміду, засунуў сабе пад куртку і выйшаў на вуліцу. Аднак, прайшоўшы ўсяго некалькі дзясяткаў метраў, быў затрыманы супрацоўнікамі галерэі, якія своечасова выявілі прапажу статуэткі.

Прыбыўшыя праз некаторы час супрацоўнікі міліцыі даставілі зламысніка ў аддзяленне міліцыі, а Феміду вярнулі на яе пастамент.

Злодзей асуджаны на тры гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

## ЕЗДЗІЎ НА АЎТО ЛІТОЎСКАГА СВАЯКА

**Беларус незаконна ездзіў на машыне свайго замежнага сваяка. Супрацоўнікі ДАІ ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, спыніўшы для праверкі дакументаў аўтамабіль «Форд Транзіт» з літоўскімі нумарамі, папрасілі кіроўцу прад'явіць дакументы, якія пацвярджаюць законнасць выкарыстання ім транспартнага сродку.**

— Як высветлілася, кіроўца «Форда», з'яўляючыся сваяком літоўскага гаспадара аўто, займаўся падвозам прадуктаў харчавання да мясцовай кавярні. І хоць з дакументамі на груз, які перавозіўся, у яго было ўсё ў парадку, у вартавых дарог паўсталі сур'ёзныя пытанні з нагоды законнасці выкарыстання аўтамашыны, — расказвае Васіль Чэпік, інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды ўпраўлення ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама. — Транспартны сродак коштам 43 мільёны беларускіх рублёў быў дастаўлены супрацоўнікамі ДАІ на ахоўную стаянку Віцебскай мытні.

Як растлумачыў намеснік начальніка аператыўна-пошукавага аддзела Віцебскай мытні Аляксей Свірыдаў, у адпаведнасці з беларускім заканадаўствам кіраваць аўтамабілем, зарэгістраваным за межамі Рэспублікі Беларусь, можа сам уладальнік транспартнага сродку, або член яго сям'і. Цяпер сваяку ўладальніка аўтамабіля з замежнымі нумарамі пагражае штраф у памеры ад 5 да 30 базавых велічынь. А пытанне аб магчымай канфіскацыі «Форда» ў бліжэйшы час павінен вырашыць суд.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 1 (19)


# НЕБА ВАРТУЕ «ТОР»

**Завяршылася пастаўка другой батарэі зенітнага ракетнага комплексу «Тор-М2» у Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Батарэя ЗРК «Тор-М2» у складзе чатырох баявых машын здольная адначасова паразіць 16 цэляў, якія ляцяць з любых напрамкаў з хуткасцю да 700 м/с на адлегласці да 12 км і вышыні да 10 км пры любых умовах надвор'я, днём і ноччу. Аналагаў расійскім ЗРК «ТОР-М2», або па класіфікацыі НАТА «латная рукавіца», што атрымала беларуская армія, у свеце няма. Комплекс забяспечвае эфектыўную супрацьпаветраную абарону ваенных і грамадзянскіх аб'ектаў, з'яўляецца сродкам паражэння самалётаў, верталётаў, аэрадынамічных беспілотных лятальных апаратаў, ракет і іншых элементаў высокадакладнай зброі. Адметныя асаблівасці «Тор-М2» — высокая манеўранасць, мабільнасць, кароткі час рэакцыі, аўтаматызацыя баявой працы.**









Урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя прыняццю батарэі ЗРК на ўзбраенне 120-й зенітнай ракетнай брыгады Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання, прайшлі ў Баранавічах, куды ў канцы 2011 года паступіла на ўзбраенне першая батарэя. А ўжо ў 2012 годзе асабовы склад пры правядзенні баявых стрэльбаў на палігоне Ашулук выканаў усе пастаўленыя задачы «на выдатна». Пераўзбраенне 120-й зенітнай ракетнай брыгады з'яўляецца яркім прыкладам плённага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Менавіта Расійская Федэрацыя з'яўляецца асноўным партнёрам нашай краіны ў пытаннях, якія тычацца паставак прадукцыі ваеннага прызначэння (узбраенне і ваенная тэхніка, запасныя часткі да іх, а таксама работы па іх рамонце і мадэрнізацыі) для патрэб Узброеных Сіл, у тым ліку на льготных для беларускага боку ўмовах. У цэлым, штогод на ўзбраенне і забеспячэнне Узброеных Сіл прымаецца да 30 і больш найноўшых узораў. Летась прыняты 38 новых узораў ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

Яшчэ адна батарэя «Тор-М2» (ужо трэцяя) паступіць у Беларусь да канца года. А цяперашнім экіпажам трэба прайсці экзамен падчас сумесных вучэнняў краін СНД «Баявая садружнасць-2013» у складзе Адзінай рэгіянальнай групоўкі войскаў ВПС і СПА.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*г. Баранавічы.*

■ З першых вуснаў

Сяргей ГЕЙСЦЕР:

# «Калі не рухацца наперад, то нічога не будзе!»

**Ні для каго не сакрэт, што сёння гарант спакойнага, мірнага жыцця — моцная супрацьпаветраная абарона. Без ваеннай авіяцыі і сродкаў супрацьпаветранай барацьбы ні адна дзяржава, у тым ліку і Беларусь, не зможа стварыць бяспеку ў паветранай прасторы. Узгадаць толькі ваенныя канфлікты апошніх дзесяцігоддзяў, якія якраз і пачыналіся з падаўлення супрацьпаветранай абароны слабейшага боку. І нават самыя сучасныя сістэмы выяўлення паветраных цэляў часам былі бяссільнымі. А ўсё таму, што навука, як кажуць, не стаіць на месцы: у той час, як адны краіны распрацоўваюць сістэмы выяўлення паветранага «ворага», іншыя — укараняюць методыкі іх падаўлення. І хто будзе першым у гэтых распрацоўках — таму і ўсе козыры.**



**Для знаёмства.** *Сяргей Гейсцер на «выдатна» скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча супрацьпаветранай абароны. Прайшоўшы стажыроўку ў Рызе і адслужыўшы тры гады ў Харкаўскай зенітна-ракетнай брыгадзе, скончыў анд'юнктуру мінскага ВІЗРУ. Прадмет, які яшчэ для курсанта Гейсцера быў найбольш складаным, у выніку стаў справай усяго жыцця. Радыёлакацыя. Пытанням гэтай ваеннай навукі ён прысвяціў не адно курсавое праектаванне, дыплом і нават кандыдацкую дысертацыю. Пазней папярэднія распрацоўкі сталі асновай для доктарскай дысертацыі. Дарэчы, пэўныя аспекты гэтай навуковай працы былі рэалізаваны ў двух праектах з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Некаторы час выкладаў у БДУІРы, дзе і атрымаў званне прафесара. Сёння Сяргей Гейсцер працуе ў Навукова-даследчым інстытуце, дзе здзяйсняе новыя адкрыцці.*

Што да айчыннай ваеннай навукі, то і ў нас у галіне стварэння сучасных сістэм супрацьпаветранай абароны вядзецца актыўная работа. Супрацоўнікі Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл Беларусі распрацоўваюць шматлікія праекты, якія знаходзяць сваё прымяненне ў беларускай арміі. Аб тонкасцях ваеннай навукі і эфектыўнасці яе прымянення ў мэтах абароны паветранай прасторы мы пагутарылі з **галоўным навуковым супрацоўнікам Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл, доктарам тэхнічных навук, прафесарам, падпалкоўнікам запасу Сяргеем ГЕЙСЦЕРАМ**.

**— Сяргей Раманавіч, у вас вельмі незвычайнае прозвішча... Адкуль вашы карані?**

— Маё прозвішча пайшло ад аўстрыйскага продка, які ў вайну 1812 года апынуўся на тэрыторыі Барысаўскага гарнізона. Па вядомых прычынах армія Напалеона, у якую ўваходзіў мой продак, адступала. І нейкім чынам сваяк апынуўся ў вёсцы Балонаўка Быхаўскага раёна, дзе і застаўся назаўсёды. Тут у яго з'явілася сям'я. Пазней у Балонаўцы нарадзіўся мой бацька, які ў Вялікую Айчынную змагаўся з ворагам у складзе стралковай дывізіі другога Беларускага фронту, удзельнічаў у аперацыі «Баграціён».

**— Атрымліваецца, што цяга да ваеннай справы вам перадалася ў спадчыну ад бацькі...**

— Не зусім так. На мой прафесійны выбар больш паўплываў родны дзядзька, які таксама быў ваенным.

**— Ваенная навука... Колькі яшчэ не сказана. А ці паставілі вы кропку ў праблеме радыёлакацыі і паветранай абароны, якой прысвяцілі не адно дзесяцігоддзе скрупулёзнай працы?**

— Вядома, не. Скажу больш: гэтай кропкі ніхто ніколі не паставіць. Час не стаіць на месцы, ён патрабуе новых навуковых адкрыццяў! Што да мяне, то зараз ёсць некалькі кірункаў, якімі я займаюся. У першую чаргу, выяўленне цэляў на адносна малых вышынях. Я якраз займаюся распрацоўкай выкарыстання акустычных і сейсмічных палёў, якія ствараюцца аэрадынамічнымі лятальнымі апаратамі. Другі кірунак — маскіроўка і імітацыя ў шматлікіх дыяпазонах выяўлення. І трэці кірунак маёй працы — радыёэлектронная барацьба, якая накіравана на падаўленне інфармацыйных сістэм боку, які нападае. Ну, і як хобі — сінтэз апертуры ў гідралакатарах для атрымання высакаякаснага малюнка марскога дна.

**— І ў чым сутнасць вашай працы?**

— Гэта распрацоўка мадэляў карысных сігналаў і перашкод, эфектыўных алгарытмаў выяўлення аб'ектаў і вызначэнне іх каардынат у шматлікіх фізічных палях. А таксама распрацоўка спосабаў і алгарытмаў для разбурэння інфармацыі аб аб'екце.

**— Вашы вынаходніцтвы паступова ўкараняюцца ў беларускай арміі. Дзе канкрэтна яны знайшлі сваё прымяненне?**

— Частка распрацовак выкарыстоўваецца ў войску ў асобных узорах узбраення. Пэўныя праекты яшчэ чакаюць запатрабавальнасці. Логіка спажывання такая, што спачатку ёсць праблема, якую патрэбна вырашыць. Прычым існуюць два варыянты. Па-першае, навука ўжо нешта зрабіла. Таму гэтыя рашэнні ляжаць на паверхні. Іх застаецца толькі ўкараніць. Па-другое, ставіцца канкрэтная задача па правядзенні навуковых даследаванняў. І толькі па дасягненні пастаўленай мэты атрымліваецца вынік, прыдатны для выкарыстання на практыцы. Для мяне навука — хобі. Таму я паспяваю выконваць і тыя задачы, якія мне ставяць, і тыя, якія я даю сабе сам. Чалавек зробіць адкрыццё толькі тады, калі ўбачыць праблему. А для гэтага патрэбна любіць сваю працу.

**— Мяркую, тады і ідэі хутчэй рэалізуюцца на практыцы?**

— Бывае па-рознаму. Для таго, каб дайсці да рэалізацыі на практыцы, дапусцім, сістэмы распазнавання, мне спатрэбілася 8 гадоў. І гэта яшчэ не самы вялікі тэрмін! Праўда, бывалі і больш хуткія праекты, як, напрыклад, распрацоўка сродкаў маскіроўкі на аснове матэрыялаў прыроднага паходжання.

**— Наколькі мне вядома, не ўсімі вашымі праектамі цікавяцца ў беларускай арміі...**

— Сапраўды. Напрыклад, яшчэ не ўкаранілі праект сістэм распазнавання. Аднак хоць не сёння, дык заўтра ён стане запатрабаваным. Як паказалі даследаванні, выкарыстанне гэтых сістэм вельмі эфектыўнае. Тым больш, што на рэалізацыю праекта спатрэбіцца няшмат сродкаў.

**— Магчыма, варта было б прадаць яго зацікаўленым замежным калегам па больш высокай цане?**

— У першую чаргу, распрацоўкі інстытута накіраваны на вырашэнне ўнутраных задач. У нас цэлы шэраг нерэалізаваных праектаў, аднак гэта не значыць, што імі патрэбна «дзяліцца» з іншымі краінамі. У мяне на гэты конт такое меркаванне: за мяжу патрэбна прапаноўваць тое, што было распрацавана ўчора. Для таго, каб за атрыманыя грошы распрацаваць тое, што будзе заўтра. Для сябе. Тым больш, трэба дакладна разумець, што можна аддаць за мяжу, а што нельга, нават калі ў сваёй краіне гэта не выкарыстоўваецца.

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

■ Тонкасці прафесіі

# «ІНТЭЛЕКТ» БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ

**У звычайным жыцці нас заўсёды суправаджаюць сродкі сувязі. Мабільныя і стацыянарныя тэлефоны, радыёстанцыі... Прычым не толькі тыя, што «вяшчаюць» на ўсю краіну. Не абысціся без пераноснай радыёстанцыі ўрачам хуткай дапамогі, пажарнікам, таксістам....**

Ва Узброеных Сілах вядзенне любых баявых дзеянняў немагчыма без прымянення сродкаў сувязі. А бывае, што перашкоды на лініях сувязі — толькі на карысць. Напрыклад, пры ўмове радыёразведкі з боку праціўніка, калі любая ўцечка інфармацыі не толькі непажаданая, але і катэгарычна забаронена! Таму існуюць падраздзяленні радыёэлектроннай барацьбы, якія займаюцца радыёэлектронным падаўленнем сродкаў сувязі і кіравання войскамі.

Радыёэлектронная барацьба лічыцца адносна маладым кірункам у ваеннай справе. Праўда, першыя прыклады вядзення радыёразведкі і стварэння радыёперашкод адносяцца яшчэ да таго часу, калі ў войску пачалі карыстацца радыё.

Больш інтэнсіўна радыёразведка стала прымяняцца ў гады Першай сусветнай вайны.

Радыёперашкоды ствараліся для парушэння радыёсувязі паміж штабамі армій, карпусамі і дывізіямі, а таксама паміж ваеннымі караблямі. Для стварэння перашкод выкарыстоўваліся звычайныя сродкі радыёсувязі. Сённяшняя армія можа пахваліцца сучаснымі спецыяльнымі сістэмамі радыёэлектроннай барацьбы.



Развіццё сродкаў стварэння перашкод непарыўна звязана з удасканальваннем сістэм перадачы інфармацыі. Штогод у воінскія часці радыёэлектроннай барацьбы Узброеных Сіл Беларусі паступаюць новыя мадэрнізаваныя ўзоры тэхнікі, здольныя аказваць уздзеянне на сучасныя віды радыёсувязі. Дарэчы, створаны яны на беларускіх прадпрыемствах. Цяпер сіламі і сродкамі радыёэлектроннай барацьбы перашкоды могуць быць пастаўлены на ўсіх асноўных напрамках кіравання войскамі і зброяй. І высокадакладная тэхніка — не выключэнне. У чым можна было пераканацца падчас наведвання 10-га асобнага батальёна радыёэлектроннай барацьбы.



— Звярніце ўвагу: мабільны комплекс радыёманіторынгу 387-га цэнтра тэхнічнага кантролю і забеспячэння абароны інфармацыі, — знаёміць з сучаснай тэхнікай **намеснік начальніка 387-га цэнтра тэхнічнага кантролю і забеспячэння абароны інфармацыі, маёр Андрэй БАГУШЭВІЧ.** — Гэты комплекс прызначаны для вядзення кантролю выкарыстанага радыёчастотнага спектра ў інтарэсах Узброеных Сіл, які ўваходзіць у адзіную сістэму радыёманіторынгу Беларусі. Комплекс працуе ў шырокім дыяпазоне частот, дазваляе ажыццяўляць пошук і вымярэнне параметраў пеленгавання крыніц радыёвыпраменьвання. Дзякуючы комплексу можна знайсці крыніцы наўмысных і незнарокавых перашкод, вызначыць іх месцазнаходжанне.

Наўмысныя перашкоды ў мірны час, у асноўным, выключаны. Калі ж такое здараецца, то звычайна гэта праца радыёхуліганаў. Што тычыцца незнарокавых перашкод, то яны ўзнікаюць дастаткова часта. Асабліва ў наш час, калі вельмі інтэнсіўна развіваецца радыёсувязь.

— Дапусцім, устанавілі тут вышку сотавай сувязі, — расказвае **начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генеральнага штаба Узброеных Сіл, палкоўнік Ігар ДАНІЛЬЧЫК**. — Можа так скласціся, што побач знаходзіцца радыёстанцыя Міністэрства абароны. І калі своечасова не правесці аналіз выкарыстання радыёчастотнага спектра гэтай мясцовасці, то атрымаецца, што ці першыя будуць парушаць працу радыёэлектронных сродкаў, ці другія. А спажыўцы будуць скардзіцца мабільнаму аператару на дрэнную якасць сувязі.

Любая тэхніка радыёэлектроннай барацьбы спачатку ажыццяўляе радыёэлектронную разведку, а затым адбываецца падаўленне радыёперашкод. Далёкасць падаўлення залежыць ад таго, у якім дыяпазоне працуе пэўная радыёстанцыя. У КВ-дыяпазоне далёкасць можа складаць да паўтары тысячы кіламетраў. Што тычыцца УКВ-дыяпазону, то тут характэрны такі прынцып: чым вышэй падымаецца антэна, тым далей ажыццяўляюцца радыёперашкоды (звычайна 30—40 кіламетраў).

Адным з галоўных напрамкаў дзейнасці органаў кіравання радыёэлектроннай барацьбы з'яўляецца забеспячэнне воінскіх часцей кваліфікаванымі кадрамі. Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўляецца ў Ваеннай акадэміі, цэняцца і выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Ваеннаслужачыя тэрміновай службы за паўтара года, што знаходзяцца ў войску, авалодваюць ваеннаўліковай спецыяльнасцю аператара. Узровень падрыхтоўкі спецыялістаў радыёэлектроннай барацьбы неаднаразова атрымліваў высокую адзнаку падчас розных мерапрыемстваў падрыхтоўкі войскаў.

— Галоўны крытэрый, на які мы звяртаем увагу пры падборы персаналу для радыёэлектроннай дзейнасці, — добрае веданне фізікі і матэматыкі, — зазначыў **камандзір 10-га асобнага батальёна радыёэлектроннай барацьбы Раман ШАБАНЕЦ**. — Уся тэхніка, якая паступае на ўзбраенне батальёна, з'яўляецца сучаснай. Ганарымся, што яе вырабляюць беларускія прадпрыемствы. Адпаведна для навучання маладога вайскоўца ці пры далейшым удасканаленні яго навыкаў без моцных ведаў у галіне дакладных навук не будзе поспеху. Падчас прызыўной кампаніі прадстаўнікі часці адбіраюць тых людзей, якія інтэлектуальна здольныя выканаць задачу на сучаснай складанай тэхніцы. Таму невыпадкова мы аддаём перавагу спецыялістам з вышэйшай адукацыяй.

...Зазірнуўшы ў адзін з разгорнутых мадэрнізаваных пунктаў, прызначаны для кіравання станцыямі перашкод радыёсувязі, упэўнілася, што тут працуюць адны прафесіяналы! Поле бою — эфір, на ўзбраенні — камп'ютар, праціўнік — віртуальны. Толькі задача ўсё тая ж — абарона Радзімы.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БЕЛТА.**

■ З рэдакцыйнай пошты

# У МЕРАБЕЛІ НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ

**Каля ўезду ў вёску Мерабель, што ў Мазырскім раёне, — арыгінальны помнік: благаславёныя праваслаўным крыжам тры гранітныя камяні, якія сімвалізуюць дружбу і брацтва трох славянскіх народаў: рускага, беларускага і ўкраінскага.**

Тут на трэці дзень 60-годдзя Вялікай Перамогі адбылася цырымонія перапахавання астанкаў невядомага салдата, які загінуў у баі за вёску Мерабель у студзені 1944 года. Каля 40 воінаў Чырвонай Арміі засталіся тады на полі бою. А гэтага забітага чырвонаармейца, які не меў пры сабе дакументаў, выпадкова знайшла ў лесе непадалёк ад вёскі і дапамагла арганізаваць пахаванне на правым крутым беразе р. Тур жыхарка Мерабелі Ефрасіння Лук'яновіч.

Пазней узнікла яшчэ адна неабходнасць перапахавання астанкаў воіна: цэласнасці магілы пагражаў разбуральны падмыў берага паводкай. З гэтым справіліся ваеннаслужачыя 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна.

Пазней у адным радзе з магілай невядомага салдата былі ўстаноўлены тры мемарыяльныя пліты: дзве — з імёнамі 26 загінулых падчас вайны землякоў і адна — з імёнамі 22 мерабельцаў, якія пайшлі з жыцця ў пасляваенныя гады.



**Андрэй Прус (злева).**

Сярод іх — Прус Андрэй Парфёнавіч 1888 года нараджэння, бацька семярых дзяцей. Быў добрым земляробам, страсным паляўнічым і пчаляром. У 1909 годзе абвянчаўся з 18-гадовай Надзеяй Афанасьеўнай Жураўскай з в. Турбінка Слабада-Скрыгалаўскай воласці Мазырскага павета. У 1914 годзе, калі ў маладой сям'і падрасталі трое дзяцей, Андрэя Парфёнавіча мабілізавалі на Першую сусветную вайну. Змагаўся ён з ворагам у складзе 1-га Казацкага кавалерыйскага корпуса. За храбрасць у баях Андрэй Прус быў узнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі.

14 студзеня 1944 года — дзень вызвалення Мерабелі і ўсёй Мазыршчыны — аказаўся апошнім днём жыцця Андрэя Парфёнавіча. Гітлераўцы, якія цярпелі паражэнне, расправіліся з ім за сувязь з партызанамі, забіўшы ў двары ўласнага дома.

Адпавядаюць двойчы Георгіеўскаму кавалеру ўсе тры яго сыны. Старэйшы, Харытон, паспяхова скончыўшы Прудкоўскую сярэднюю школу, працягваў вучобу ў ВНУ Ленінграда, дзе яго і заспела вайна. Геройскі загінуў пры абароне калыскі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1943 годзе. Сярэдні, Андрэй, з'ехаў у Сібір. Служыў у НКУС. Храбра змагаўся пад Сталінградам, быў забіты пры абароне волжскай цвярдыні ў 1942 годзе. А вось самаму малодшаму з іх, Васілю, які не раз перанёс неймаверна суровыя выпрабаванні ў савецка-фінскай і Вялікай Айчыннай войнах, удалося выжыць, хоць бацькі атрымалі на яго ажно дзве пахавальныя.

**14 студзеня 1944 года — дзень вызвалення Мерабелі і ўсёй Мазыршчыны — аказаўся апошнім днём жыцця Андрэя Парфёнавіча.**

Службу ў Чырвонай Арміі Васіль Прус пачаў у 1938 годзе ў 28-м корпусным артылерыйскім палку. Ён двойчы штурмаваў «лінію Манергейма» — магутную лінію абароны Фінляндыі на Карэльскім перашыйку глыбінёй 80—100 кіламетраў, у складзе артдывізіёна трымаў абарону «Дарогі жыцця» зімой 1941—1942 гг., вёў баі каля Сінявінскіх балот, у складзе 9-й брыгады марской пяхоты ўдзельнічаў у разгроме буйных сіл ворага ў Прыбалтыцы, у блакіраванні і паланенні 280-тысячнай групоўкі нямецкіх войскаў на Латвійскім паўвостраве Курляндыя. Ажно да 28 мая 1945 года працягваў удзельнічаць у баявых аперацыях па ачыстцы паўвострава ад рэшткаў варожых войскаў, якія хаваліся ў лясах. Дэмабілізаваўся ў студзені 1947 г. Па волі аднавяскоўцаў адразу ўзначаліў брыгаду ў родным калгасе «17-ы партз'езд». 35 гадоў адпрацаваў электраманцёрам у Мазырскім РЭС. Ветэран энергетыкі БССР. З жонкай Марыяй Андрэеўнай выхавалі сына і дзвюх дачок.

З усіх узнагарод Васіль Андрэевіч асабліва шанаваў і ганарыўся медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі». 18 жніўня 2002 года Васіля Андрэевіча не стала.

У мемарыяльным спісе помнікаў — добра вядомыя мне Іван Ганчароў і Фёдар Кедыш. З першым давялося разам працаваць на Мазырскім ДАКу: я — аператарам, ён — памочнікам аператара цэха драўнінnастружкавых пліт; з другім — нарадзіцца і 19 гадоў жыць у адной вёсцы.

Іван Ганчароў родам з вёскі Папова Глушкоўскага раёна Курскай вобласці. Прызваўся ў Чырвоную Армію ў верасні 1943 года і па кастрычнік 1944 года ваяваў зараджальшчыкам гарматы ў складзе 1-й асобнай артылерыйскай брыгады.

У вёску Мерабель маладога артылерыста прывялі «вогненныя вёрсты вайны», калі яму якраз аднаго месяца не хапіла да 19 гадоў. Ён у складзе 2-й батарэі 1816 артпалка 13—14 студзеня 1944 года вёў бой па вызваленні Мерабелі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А некалькімі днямі пазней на прасёлкавай дарозе, што праходзіла каля батарэі, Івану сустрэлася дзяўчына-мерабелька Паліна Прус.

**Ордэнам Айчыннай вайны, медалём «За перамогу над Германіяй» і многімі знакамі баявой воінскай славы адзначаны ўклад у разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў Івана Ганчарова.**

Але расслабляцца ваенным было не дадзена: ішла ўзмоцненая падрыхтоўка войскаў да Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён». Удзельнічаючы ў ёй, Ганчароў вызваляў Жлобін, Бабруйск, Слуцк, Клецк. Быў паранены. Пасля шпіталя быў накіраваны ў чыгуначныя войскі. Займаўся аднаўленнем галоўных пуцей і мастоў у паласе наступлення Беларускіх франтоў. І, як абяцаў, прыбыў у Мерабель, да сваёй каханай Паліны.

Усё жыццё працавалі не пакладаючы рук, былі прыкладам для іншых. Пабудавалі дом. Вырасцілі і выхавалі семярых дзяцей. Жылі цяжка, але весела. Іван Фролавіч па натуры быў весялун: віртуозна іграў на шэрагу струнных шчыпковых музычных інструментаў, валодаў незлічоным запасам анекдотаў, прымавак, песень і прыпевак, цудоўна спяваў, акампануючы сабе на балалайцы або гітары, асабліва любіў выконваць лірычныя песні ваенных гадоў.

Ордэнам Айчыннай вайны, медалём «За перамогу над Германіяй» і многімі знакамі баявой воінскай славы адзначаны ўклад у разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў Івана Ганчарова.

Фёдар Кедыш 1920 года нараджэння, жыхар в. Турбінка Мазырскага раёна, у Чырвоную Армію прызваўся 9 мая 1941 года. Служыў у 99-м стралковым палку. Ваяваў у яго складзе да сярэдзіны лістапада 1941 года, да пададання палка ў акружэнне. Праз нейкі час, пасля выхаду з акружэння, Кедыш уступіў у партызанскі атрад, які базіраваўся ў глухіх лясах каля роднай Турбінкі і пасля ўвайшоў у створаную 28 верасня 1941 г. Мазырскую партызанскую брыгаду імя Аляксандра Неўскага. Удзельнічаў у баях па вызваленні Мазыршчыны ад 875-дзённага фашысцкага палону.

З красавіка 1944 года яфрэйтар Кедыш зноў у Чырвонай Арміі — курсант роты процітанкавых ружжаў 39-га асобнага запаснога палка. А з мая 1944 г. — удзельнічаў у баях у складзе гэтай жа роты 338-га стралковага палка. 16 ліпеня 1944 года атрымаў раненне, з-за чаго 5 месяцаў знаходзіўся на лячэнні ў эвакшпіталі, пасля чаго быў накіраваны ў 190-ы асобны дапаможны аўтабатальён кухарам.

Удзельнічаў у Берлінскай наступальнай аперацыі. Узнагароджаны медалямі: «За ўзяцце Берліна», «За адвагу», «За перамогу над Германіяй». Дэмабілізаваўся 19 чэрвеня 1946 года.

Працаваў у родным калгасе. Быў добрым гарманістам. Ніводная вечарынка, вяселле, хрэсьбіны або провады ў войска не праходзілі ў вёсцы без яго музыкі.

Салдаты Перамогі з Мерабелі пакінулі гэты свет, дастойна прайшоўшы свой няпросты жыццёвы шлях на зямлі. Няхай будзе вечнай памяць пра іх!

**Уладзімір ЖУРАЎСКІ, ветэран працы.**



**Сяргей Гейсцер дэманструе свае распрацоўкі дзяржсакратару Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь Віктару Шэйману і міністру абароны Расійскай Федэрацыі Сяргею Іванову падчас вучэнняў «Шчыт Саюза» (2006 год).**

# «Калі не рухацца наперад, то нічога не будзе!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

**— А ці варта тады імкнуцца наперад, яшчэ нешта прыдумляць?**

— Калі не рухацца наперад, то нічога не будзе! Як некалі казаў мой настаўнік Віктар Курловіч, наперадзе той, хто ідзе. А не той, хто сядзіць (дадаў ужо я ад сябе). Таму патрэбна браць вучняў, ехаць у поле, праводзіць эксперыменты...

**— А вучні такія ж энтузіясты, як і вы?**

— Спадзяюся! Сёння ў мяне 10 кандыдатаў навук. У кожнага з іх — свая тэма, якая датычыцца абароны: пачынаючы ад радыёлакацыі і заканчваючы гідралакацыяй. Магчыма, калісьці гэтыя праекты будуць рэалізаваны. Пакуль яны афармлены ў выглядзе навуковых дысертацый, прычым некаторыя з іх нават запатэнтаваны.

**— А ці ёсць сярод вашых распрацовак патэнты?**

— Не бачу сэнсу марнаваць час на афармленне патэнтаў. Для абароны аўтарскіх правоў дастаткова публікацыі ў СМІ. Таму невыпадкова мае навуковыя працы даволі часта выходзяць у беларускіх і рускіх навуковых выданнях.

**— Вы казалі, што ў вашай творчай скарбонцы ёсць працы па гідралакацыі. А наколькі ў нашай краіне, у якой няма нават самага маленькага мора, актуальна распрацоўка сістэм па вызначэнні месцазнаходжання падводных аб'ектаў?**

— Вядома, у Беларусі, гэты кірунак шырокага распаўсюджвання не мае. Аднак у той жа час гідралакацыя можа прымяняцца і ў іншых сферах. Напрыклад, ёсць плаціны, якія часам патрабуюць аховы. Захочацца некаму яе падарваць — затапіць бліжэйшыя вёскі. Гідралакатарныя ўстройствы — добрая абарона і ад браканьераў. У цэлым, сферы прымянення сістэм гідралакацыі вельмі разнастайныя: ад абароны важных аб'ектаў да аховы экалогіі.

**— А ці ёсць альтэрнатыва ваеннай навуцы?**

— Альтэрнатыва ёсць. Бяспека дзяржавы будуецца па прынцыпе: пачынаючы ад прадухілення самой думкі аб агрэсіі, да абароны краіны. Аднак без навукі нават сфармуляваць гэтую думку складана. Таму пакуль без яе не абысціся.

**— Навуковая дзейнасць патрабуе шмат часу. А вы яшчэ працуеце ў Савеце па абароне дысертацый у інстытуце, з'яўляецеся членам экспертнага савета Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Як з усім спраўляецеся?**

— Знаходзіць час неабходна на ўсё. Праўда, на жаль, мастацкую літаратуру ўжо так не пачытаеш, як раней. Хаця ў свой час прачытаў шмат твораў Быкава, Караткевіча, Купалы. Вельмі люблю «Новую зямлю» Коласа, творы Купалы. Увогуле, беларускую літаратуру патрэбна чытаць хаця б з-за таго, каб атрымаць асалоду ад шыкоўнай музычнай мовы, адчуць каларыт мясцовай прыроды, улавіць водар нашага роднага краю.

**Гутарыла Вераніка КАНЮТА.**

# ВЫНАХОДНІКІ З АРМЕЙСКАЙ «ВУЧЭБКІ»

**У 72-м гвардзейскім Аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў нямала выкладчыкаў, якія на працягу многіх гадоў дабіваюцца стабільных вынікаў у навучанні і выхаванні курсантаў. Многія з іх актыўна ўдзельнічаюць ва ўдасканаленні вучэбна-матэрыяльнай базы школ, укараняючы ў практыку свае ўнікальныя распрацоўкі. Шырокае выкарыстанне такіх вынаходстваў у навучальным працэсе дапамагае маладым воінам не толькі аблегчыць засваенне складанай тэхнікі, атрымаць неабходныя практычныя навыкі і ўменні па ваенна-ўліковай спецыяльнасці, але і сэканоміць пры гэтым вучэбны час, матарэсурс і паліва.**



**Афіцэр запасу Ігар Сіманаў, дэманструе трэнажор, які актыўна выкарыстоўваецца ў навучанні воінаў-хімікаў.**

З гэтага навучальнага перыяду на ўзбраенне 59-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў аўтамабільнай тэхнікі і рамонтных падраздзяленняў прыняты дзейны стэнд падагравальніка ПЖД-600Е, прызначаны для індывідуальнага практычнага навучання механікаў-кіроўцаў МАЗ-543 па запуску агрэгата без прыцягнення матэрыяльнай часткі аўтамабіля. **Галоўны распрацоўшчык ноу-хау — выкладчык цыкла кіравання і тэхнічнай падрыхтоўкі падпалкоўнік запасу Мікалай КАРАКІН.**

— Галоўная вартасць вынаходства — нагляднасць і эканамічны эфект, — перакананы Мікалай Ігнатавіч. — Яшчэ да нядаўняга часу, каб правесці з курсантамі планавы заняткі па запуску падаграваньніка, неабходна было выгнаць з парка шматвосевую машыну на спецыяльную пляцоўку. Акрамя гэтага, у адпаведнасці з кіруючымі дакументамі па мерах бяспекі, патрабавалася наяўнасць пажарнай машыны з разлікам. Для правядзення практычнага запуску падаграваньніка толькі на аднаго навучэнца выдзяляўся як мінімум літр дызельнага паліва, пастаянна выкарыстоўвалася акумулятарная батарэя аўтамабіля ў рэальных умовах. Прычым за адну трэніроўку трацілася 20—25 хвілін каштоўнага вучэбнага часу. Вось і прыйшла думка стварыць нешта такое, што магло б аблегчыць засваенне шматвосевай машыны.

Спецыялісты падлічылі, што на падобных трэніроўках з прымяненнем стэнда Каракіна паліва выкарыстоўваецца ў 15 разоў менш, чым на машыне ў рэальных умовах. І гэта не лічачы мотарэсурсу, які б расходаваўся для выхаду цяжкага шматвосевага аўтамабіля на спецыяльна абсталяваную пляцоўку і пастаноўку яго назад у парк. Што да прапускной здольнасці стэнда, то яго выкарыстанне дазваляе навучыць аднаго курсанта ўсяго за пяць хвілін: за тры вучэбныя гадзіны практычныя навыкі ў стане атрымаць ваеннаслужачыя вучэбнага падраздзялення.

Ёсць свае Кулібіны і ў 320-й школе падрыхтоўкі спецыялістаў мотастралковых, разведвальных падраздзяленняў інжынерных войскаў і войскаў РХБЗ, якой цяпер камандуе **падпалкоўнік Вячаслаў ШЧАРБІН**. Тут выкладчыцкі склад воінскай часці з ліку афіцэраў запасу плённа працуе над удасканаленнем наяўных узораў вучэбна-трэніровачных і трэнажорных сродкаў.

Напрыклад, нядаўна ў школу паступіў новы трэнажор для падрыхтоўкі разлікаў баявой разведвальнай дазорнай машыны РХБ разведкі Т-БРДМ-2 РХБ. Трэнажор, безумоўна, добры. І карысць ад яго відавочная. Але для большай нагляднасці і даступнасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў яго вырашылі ўдасканаліць. Пад агульным кіраўніцтвам выкладчыка 1-га цыклу вучэбнай часці маёра запасу Генадзя КІБЕЦА падключылі вучэбныя ракеты СКТ і сістэму механічнай устаноўкі знакаў агароджы, стварылі для навучэнцаў сістэму імітацыі бактэрыялагічных рэчываў у паветры. Сёння мадэрнізаваны макет дазорнай машыны РХБ разведкі — незаменны сродак у падрыхтоўцы курсантаў па ваенна-ўліковай спецыяльнасці.

Здзівіў сваім талентам вынаходніка і **выкладчык 1-га цыкла 320-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў капітан запасу Ігар СІМАНАЎ**. Шэсць месяцаў спатрэбілася яму, каб распрацаваць і ўкараніць у практыку ўласны трэнажор дымавой машыны ТДА-2М, прызначаны для навучання курсантаў у падрыхтоўцы абсталявання да працы і правядзення практычнага дымапуску без выкарыстання рэальнай тэхнікі.

— У рэальных умовах толькі за адну гадзіну працы такой машыны расходуецца 800 літраў спецыяльнай вадкасці, аснову якой складае дызельнае паліва і бензін, — распавядае Ігар Сіманаў. — Няцяжка падлічыць, колькі гэта ў грашовым эквіваленце. У вучэбных мэтах гэтыя сродкі ператвараюцца ў дым. Вось і вырашыў вынайсці трэнажор, які б працаваў не толькі ў інтарэсах якаснай падрыхтоўкі курсантаў, але і меў бы эканамічны эфект. Атрымалася!

Вось ужо больш як два гады немудрагелістае, на першы погляд, вынаходства Сіманава, зробленае практычна з падручных матэрыялаў, актыўна выкарыстоўваецца пры навучанні воінаў-хімікаў. Відавочная і эканомія немалых сродкаў: за гадзіну вучобы на трэнажоры расходуецца толькі 150-180 кілават электраэнергіі!

Як высветлілася, гэта ўжо не першая рацыяналізатарская прапанова, якую ўкараніў у практыку афіцэр запасу Ігар Сіманаў. І верыцца, што не апошняя. Наша зямля багатая на таленты. А каб не перавяліся кулібіны і ў вайсковым асяроддзі, іх ноу-хау трэба ўсяляк падтрымліваць.

**Мікалай МАКАРЭВІЧ. Фота аўтара.**

■ Пытальнік

***Мой сын па стане здароўя прызнаны непрыдатным да службы ў войску. Дыягназ — язва дванаццаціперснай кішкі. У ваенным білеце напісана: «Да службы ў войску ў мірны час не прыдатны, перагляд у 2015 годзе». Восенню 2012 года выйшаў указ, згодна з якім хворыя на язву прызываюцца на службу. Хачу даведацца, ці датычыцца гэтае новаўвядзенне майго сына?***

**Жыхарка,** *в. Сваткі, Мінская вобл., Мядзельскі р-н.*

— Як паведамілі ў Міністэрстве абароны Рэспублікі Беларусь, да 2015 года маладога чалавека прызываць на службу ў войска не будуць, паколькі ў яго ўжо ёсць ваенны білет. Пасля ўказанага тэрміну, пры ўмове, што юнак па ўзросце яшчэ будзе прыдатны для армейскай службы, ён павінен будзе прайсці паўторную медыцынскую камісію, па выніках якой і будзе вызначана: прыдатны грамадзянін для службы ў войску ці не. Што датычыцца пытання адмены адтэрміновак для хворых на язву, то гэта неадназначны вердыкт. Справа ў тым, што рашэнне аб службе юнака ў арміі будзе залежыць ад ступені гэтага захворвання.

■ Падгледжана з жыцця

# НЕПРЫДУМАНЫЯ ГІСТОРЫІ

**За час маёй журналісцкай дзейнасці давялося пачуць нямала цікавых гісторый ад суразмоўцаў, якія носяць пагоны. Многія, на жаль, ужо забыліся, але самыя смешныя помняцца да гэтай пары. Дзве з іх — на «зімовыя» тэмы.**

## «Снежны чалавек»

У 1980-я гады давялося служыць у адной роце з сапраўдным сібіраком, лейтэнантам Уладзімірам Пастухом. Сярод афіцэраў мотастралковага батальёна ён вылучаўся не толькі высокім ростам (два метры два сантыметры), але і памерам абутку. Хромавыя боты ў яго былі 53-га памеру. Увесь абутак Уладзімір заўсёды шыў па індывідуальным заказе, таму што нешта знайсці для яго ў краме «Ваенгандлю» або на рэчавым складзе было проста нерэальна.

— З такімі «ластамі» ў балоце ніколі не захраснеш, — жартавалі мы часам з саслужыўца-волата.

Дарэчы, Бог не абдзяліў хлопца і сілай. На спаборніцтвах па гіравым спорце ён заўсёды быў у ліку прызёраў. Але гаворка не пра гэта.

Раскажу гісторыю, якая адбылася з Уладзімірам падчас яго курсанцкіх канікулаў. Пасля здачы зімовай сесіі вырашыў ён «махнуць» да свайго дзеда. Той даўно запрашаў яго ў госці. Прыязджай, маўляў, мядком пачастуешся, у тайгу на мядзведзя сходзім.

Уважыў старога — паехаў. Толькі ў прыцемках 19-гадовы хлопец дабраўся ў знаёмую з дзяцінства глухую сібірскую вёску. Спаць леглі позняй ноччу, засядзеліся каля самавара. Было пра што пагаварыць дзеду з любімым унукам. Раніцай курсант па звычцы ўжо быў на нагах. Нацягнуўшы авечы кажух і абуўшыся ў спецыяльна збітыя дзедам валёнкі нежартаўлівага памеру, Уладзімір выйшаў прагуляцца па свежым снезе, які выпаў за ноч.

Крыху пазней бабуля-суседка, выйшаўшы да калодзежа па ваду, заўважыла вялізныя свежыя сляды, якія вялі ў тайгу. Па вёсцы імгненна разляцелася навіна аб тым, што ў іх у гасцях зусім нядаўна пабываў «снежны» чалавек. Шмат пра яго напярэдадні па тэлевізары расказвалі. На табе — аб'явіўся! Вяскоўцы, выказаўшы непадробную цікавасць, аператыўна сабраліся гуртам, каб праследаваць нябачнага «звера» па выразных слядах. На шчасце, групу людзей, узброеную віламі і стрэльбамі, своечасова спыніў дзед Пастуха.

— Ды гэта ж мой Валодзька! Унучак учора на пабыўку прыехаў, — унёс ён поўную яснасць у паходжанне «чужых» слядоў.

У хуткім часе мужыкі сарамліва віталіся з будучым афіцэрам, які вярнуўся пасля ранішняй прагулкі, і касілі вокам на яго вялізны абутак. Доўга яны пасля смяяліся з амаль сапраўднага «снежнага» чалавека.

## Перастараўся

Гэты выпадак расказаў мне знаёмы афіцэр з 72-га гвардзейскага Аб'яднанага навучальнага цэнтра. Гісторыя адбылася з яго аднакурснікам і саслужыўцам Андрэем Няфёдавым (прозвішча зменена) на пачатку афіцэрскай кар'еры. Пасля паспяховага заканчэння ваеннага вучылішча іх разам накіравалі для далейшага праходжання службы ў Групу савецкіх войскаў у Германіі.

Камандзір палка, куды прыбылі маладыя афіцэры, яшчэ з лета дамовіўся з мясцовым егерам узяць у таго ў гаспадарцы дваццаць блакітных елак для добраўпарадкавання тэрыторыі часці і ваеннага гарадка. Позняй восенню, калі наблізіўся час пасадкі дрэў, камандзіру батальёна паставілі задачу — запланаваць машыну і выдзеліць каманду на чале з афіцэрам для дастаўкі лясных прыгажунь з пітомніка.

Выканаць гэтую «місію» выпаў гонар лейтэнанту Няфёдаву. Прыхапіўшы з сабой неабходны інструмент, бравы малады афіцэр разам з двума падначаленымі з самай раніцы адбылі па назначэнні.

Увечары машына са «спецгрузам» паспяхова вярнулася ў вайсковую часць.

— Таварыш палкоўнік! Ваш загад выкананы, — не ўтойваючы радасці, далажыў малады афіцэр. — Удалося ўзяць нават больш за пазначаную колькасць...

— Малайчына, лейтэнант, — пахваліў яго камандзір палка за старанне і праяўленую ініцыятыву.

Але пахвала, як аказалася, была заўчаснай. Калі сталі разгружаць маладыя саджанцы ў прызначанае месца, настрой у камандзіра рэзка змяніўся, а твар перакасіўся ад гневу.

— Вы што, таварыш лейтэнант, жартаваць са мной надумалі? — зло вылаяўся палкоўнік. — Вам камандзір батальёна якую задачу ставіў?

З хвіліну малады афіцэр разгублена глядзеў то на камандзіра, то на гару спілаваных пад корань блакітных елачак.

— Вось і я падумаў, таварыш палкоўнік: навошта ўжо ў лістападзе да Новага года рыхтавацца? — толькі і змог блытана адказаць лейтэнант Няфёдаў.

**Мікалай МАКАРЭВІЧ**

■ Сустрэча ў часці

# І ПАЙШЛА ГАВОРКА, І ПАЛІЛІСЯ ПЕСНІ...

**По добрай традыцыі, у клубе 49-й радыётэхнічнай брыгады паўночна-заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Рэспублікі Беларусь кожны тыдзень праходзяць мерапрыемствы для асабовага складу часці.**



На гэты раз у часці чакалі госця. У клубе павінна адбыцца літаратурна-музычная імпрэза. Тут, як гавораць, і яблыку не было дзе ўпасці. Некаторым гледачам нават не хапіла месца.

Загадчыца клуба прадставіла вайскоўцам госця — вядучага стылістычнага рэдактара газеты «Звязда», сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрыя Пятровіча. І пайшла гаворка, і паліліся песні... І ўсё так складна і ладна, а галоўнае — цікава! Уздымаліся розныя тэмы: стаўленне да нашай роднай мовы ў грамадстве; якой павінна быць наша літаратура, каб зацікавіць чытача; стан сучаснай культуры з пункту погляду маладога пакалення... І, безумоўна, асобнай тэмай для размовы (з гэтага і пачалася сустрэча) стала газета «Звязда». Далей пісьменнік прачытаў урывак са свайго апавядання «Анёлы», яшчэ больш захапіўшы аўдыторыю. І вось ён бярэ ў рукі гітару і прафесійна пастаўленым голасам пачынае выконваць свае песні, якіх у яго творчай скарбонцы больш за сто. Прычым як на свае вершы, так і на словы Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Караткевіча, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, В. Шніпа, М. Шабовіча, М. Башлакова, Н. Гальпяровіча, А. Аўруціна і іншых паэтаў. Твары хлопцаў прасвятлелі: як прыемна чуць родную мову, такую шчымлівую і лагодную! Як прыемна на свае вочы бачыць пісьменніка — твайго сучасніка! Такія сустрэчы вельмі патрэбны маладым людзям, якія нядаўна апранулі вайсковую форму.



Час ляціць вельмі хутка — паўтары гадзіны прайшлі непрыкметна. Дзмітрый Леанідавіч паспеў яшчэ правесці і прэзентацыю сваёй кнігі прозы «Белая Жанчына». Кніга не так даўно ўбачыла свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці», а ўжо рыхтуецца яе перавыданне.

Час развітвацца. Напрыканцы аўтар падарыў бібліятэцы частку сваіх кніг — паэзіі і прозы. Цікава, што на развітанне нехта з вайскоўцаў «папрарочы» сказаў: «Напэўна, убачым сябе ў «Звяздзе».

Няхай так і будзе. А мы будзем чакаць новых сустрэч з Дзмітрыем Пятровічам і чытаць нашу любімую беларускую газету.

**Ала ЦЯЦЁРКІНА, загадчыца клуба.**

■ У чаканні свята

# БЫХАЎ ВЫЙДЗЕ НА СУБОТНІК

**У Быхаве распачалася падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства. Падчас апошняй працоўнай нарады абмеркаваны планы дзеянняў па падрыхтоўцы кожнага аб'екта, паведаміла начальнік аддзела ідэалагічнай працы Быхаўскага райвыканкама Маргарыта Батвянкова.**

У Быхаўскім замку будуць найперш адноўлены дзве абарончыя вежы і брама на ўездзе. Улетку на тэрыторыі замка пройдуць археалагічныя раскопкі і наведзены парадак, каб у часе свята там запрацавала гісторыка-тэатралізаваная пляцоўка «Літаратурная спадчына — ад крыніц да сучаснасці».

Будынак сінагогі ў Быхаве, які датуецца пачаткам XVII стагоддзя, плануюць накрыць дахам, а для наступных работ адкрыць дабрачынны рахунак для збору сродкаў. Старую воданапорную вежу на вакзале ўвянчае гадзіннік, а зрабіць кавярню ў ёй прапануюць інвестарам. Там жа, на чыгуначным вакзале, з'явіцца цягнік як музейны экспанат і месца для дзіцячых забаў. У Быхаве таксама пабудуюць басейн і добраўпарадкуюць гарадскі стадыён. Гісторыка-краязнаўчы музей пераедзе ў гістарычны будынак, які быў пабудаваны яшчэ да рэвалюцыі для мужчынскай гімназіі.

На цэнтральнай вуліцы Леніна зробяць рамонт жылых дамоў. Бліжэй да свята для іх жыхароў будзе прапанаваны конкурс на лепшае афармленне балконаў і вокнаў. Увогуле ў падрыхтоўцы да свята будуць браць актыўны ўдзел самі быхаўчыне, і першы суботнік у горадзе запланаваны ўжо на студзень.

**Ілона ІВАНОВА**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Аукцион состоится 19.02.2013 г. в 10.30 по адресу: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5 , к. 3, кабинет №217.**

Организатором аукциона является РУП «Белпочта» в лице Минского филиала РУП «Белпочта», находящегося по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**Лот №1.** Помещение на 2 этаже площадью 43,3 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 18, в удовлетворительном состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 584 550 рублей, размер задатка – 58 455 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, осуществление торговли, оказание услуг, производственных целей (за исключением вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот №2.** Помещения на 1 этаже площадью 79,2 (39,8; 19,1; 20,3) кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, пер. Черняховского, 18, в удовлетворительном состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 1 069 200 рублей, размер задатка – 106 920 рублей, целевое использование – размещение офиса, складских помещений, осуществление розничной торговли, оказание услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 1,5.

**Лот №3.** Помещение на 2 этаже площадью 28,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д.10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 386 100 рублей, размер задатка – 38 610 рублей, целевое использование – размещение офисов, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот №4.** Помещение на 2 этаже площадью 35,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д.10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 484 650 рублей, размер задатка – 48 465 рублей, целевое использование – размещение офисов, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот №5.** Помещение на 1 этаже площадью 280,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д.10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 3 788 100 рублей, размер задатка – 378 810 рублей, целевое использование – размещение складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот №6.** Помещение на 2 этаже площадью 37,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 31, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 507 600 рублей, размер задатка – 50 760 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, оказание услуг, осуществление торговли, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот №7.** Помещение на 3 этаже площадью 63,7 (61,6; 2,1) кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 31, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 859 950 рублей, размер задатка – 85 995 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, оказание услуг, осуществление торговли, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот №8.** Помещение на 2 этаже площадью 17,1 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. III Интернационала, д.186, в хорошем состоянии, срок аренды 5 лет, начальная цена продажи – 230 850 рублей, размер задатка – 23 085 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, осуществление торговли, оказание услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

Документы на участие в аукционе принимаются с 21.01.13 г. по 15.02.13 г. в рабочее время (с 10.00 до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, кабинет 103. Документы, поданные после 16.00 15.02.13 г., не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на субсчет 3012205780018 в Минском отделении БелАПБ, код 942, УНП 101120215, Минский филиал РУП «Белпочта»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

**Помимо указанных документов:**

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и приведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефон для справок: (8 017) 213 28 18, факс (8-017) 207 75 67.**


# ЖЫЦЦЁ Ў ПАЗЫКУ

## Наколькі рацыянальна браць крэдыты

**Што лепш: аформіць пакупку ў крэдыт? А можа, назапасіць грошай? Хто з нас не задаваў сабе такія пытанні?**



А насамрэч, што лепш: назапасіць грошай або атрымаць жаданую рэч адразу дзякуючы крэдыту? Асаблівая размова пра тое, калі хочацца зладзіць наваселле або трэба купіць аўтамабіль. Напрыклад, у вас ёсць палова ад неабходнай і вельмі немалой сумы. У такім выпадку трэба звярнуцца па дапамогу ў банк ці ўсё ж такі грошы далей збіраць? Але на апошняе можна патраціць гады...

### АБ ПАКУПЦЫ КВАТЭР

Вы паставілі перад сабой мэту — купіць кватэру. Калі, вядома, вы не падпольны мільянер (у доларавым эквіваленце. — **Аўт.**), часцей за ўсё пры гэтым адзінае правільнае рашэнне — звярнуцца да паслуг банка або іншай камерцыйнай структуры, якая займаецца крэдытаваннем насельніцтва. Купляць у крэдыт, будаваць трэба, бо...

1. Працэнтнае павелічэнне кошту жылля, калі меркаваць па апошніх назіраннях, можа быць большым, чым памер сярэднеўзважанай стаўкі па крэдытаванні.

2. Збіраць гадамі грошы няма сэнсу яшчэ і таму, што ў любым выпадку, нават калі вашы грошы будуць захоўвацца ў банку і вам будуць выплачваць працэнты, ваш даход з дэпазіту можа адставаць ад тэмпу павелічэння кошту нерухомасці.

Праўда, выключэннем можа стаць ўмова, калі павелічэнне вашага даходу будзе значным у параўнанні з ростам цаны на нерухомасць.

Але, калі вы зарабляеце не настолькі шмат, прыйдзецца купляць кватэру з выкарыстаннем пазыковых грошай. Памылка многіх у тым, што яны спадзяюцца на павелічэнне даходаў або (у горшым выпадку) на захаванне іх узроўню, а значыць, і на тое, што без асаблівых праблем змогуць спраўна і ў поўным аб'ёме разлічвацца з банкам за ўзяты крэдыт. Апошняе прыйдзецца рабіць своечасова штомесяц і на працягу многіх гадоў.

Вельмі правільным будзе падыход, калі прыкладна ад 30% да паловы вашых даходаў пойдуць на выплату крэдытных грошай. Не варта забываць, што нярэдка ў банках абавязваюць аформіць страхоўку жылля і вашага здароўя і жыцця. Значыць, крэдыт аўтаматычна стане даражэй.

### ЯК ЛЕПШ КУПІЦЬ АЎТО?

А ці патрэбны яно вам у бліжэйшы час? Бо, для параўнання, калі жыллёвыя ўмовы сапраўды вельмі важныя для чалавека, то ў машыне няма такой вострай неабходнасці. Калі, зразумела, яна не патрэбна для выканання, напрыклад, службовых абавязкаў і штодзённых паездак на далёкія адлегласці па асабістых пытаннях. Значыць, напэўна, можна не спяшацца з набыццём аўтамабіля? Бывалыя людзі падлічылі, што кошт аўто не павінен складаць больш за палову гадавога даходу.

Праўда, і ў выпадку з жаданнем купіць машыну можна сказаць аб парачцы «але».

1. Можна набыць машыну літаральна сёння, выкарыстоўваючы крэдыт з добрай зніжкай у бок змяншэння кошту.

2. Аўтамабілі могуць падаражэць па розных прычынах — напрыклад, з-за здачы пазіцый рубля ў адносінах да курсу долара.

Пры гэтым трэба падлічыць, наколькі выгадна будзе купіць машыну ў крэдыт, каб вы сэканомілі, а можа, і зарабілі б на сваім будучым аўто столькі, што вам сапраўды выгадна аплачваць даўгі банку.

Работнікі банкаў і аўтамабільных салонаў, дарэчы, добра навучыліся «пераконваць» кліентаў не адкладаць на заўтра тое, што можна зрабіць сёння. Пры гэтым сціпла замоўчваецца, што мэта банка і салона — зарабіць на кліентах. Бо за ўзятыя грошы давядзецца расплачвацца сваімі грашыма, ды яшчэ і пераплачваць!

### КРЭДЫТАВАННЕ НА МЕДЫЦЫНСКІЯ ПАСЛУГІ

Як гаворыцца, здароўе не купіш! Але, вядома, на сваім здароўі эканоміць не трэба. Як гавораць, бясплатную медыцыну ніхто не адмяняў, але ёсць сітуацыі, калі трэба патраціцца самому.

Калі падумаць, самы просты спосаб не задумвацца ў будучыні над тым, дзе ўзяць грошы на лячэнне, — гэта страхаванне. Пры гэтым не трэба абмяжоўвацца ў выбары памеру страхоўкі. Прымальны памер страхавання — на агульную суму ў некалькі дзясяткаў мільёнаў рублёў. У нашай краіне гэтай сумы, напэўна, хопіць нават на аплату самай складанай аперацыі і наступнай рэабілітацыі.

### НАБЫЦЦЁ БЫТАВОЙ ТЭХНІКІ

100-працэнтная праверанaя на сабе парада: не варта купляць бытавую тэхніку ў крэдыт.

Ды і, напрыклад, новая пральная машына або газавая пліта каштуюць значна танней, чым кватэра і аўто. Можна назбіраць грошы за некалькі месяцаў і купіць тое, што вам неабходна для дома. Навошта пераплачваць за рэч 1/5 і больш яе кошту, пры ўмове, што вы вырашылі купіць бытавую тэхніку ў крэдыт?

Можна купіць нядрэннай якасці бытавую тэхніку, якая ўжо была ў карыстанні.

Шматлікія крамы ідуць на «хітрасць», прапаноўваючы нешта ў крэдыт без выплаты працэнтаў. На самой справе, беспрацэнтны крэдыт у выніку ўсё роўна прывядзе да пераплаты за пакупку.

### КРЭДЫТАВАННЕ НА РАМОНТ

Ці патрэбны вам крэдытныя грошы на пакупку матэрыялаў для рамонту кватэры? Або каб наняць майстроў па рамонце? Хутчэй за ўсё, не.

Выключэннем можа стаць наваселле. Але ўсё ж варта загадзя, перад тым як улезці ў доўг перад банкам, падумаць аб тым, за якія сродкі вы будзеце рыхтаваць кватэру для пражывання.

### КРЭДЫТ НА ВУЧОБУ

Ці варта браць грошы ў банку для атрымання адукацыі? Бадай, самае цяжкае пытанне. Часцей за ўсё такія крэдыты афармляюць сваякі будучых студэнтаў.

А калі вы самі вырашылі ўзяць крэдыт на гэтую мэту, ці ўпэўнены, што вам яго дадуць? І што, атрымаўшы дыплом, вы асабіста зможаце разлічыцца з банкам за прадастаўленыя грошы? Ці будзе дастаткова высокай зарплата, каб яе хапіла на вяртанне крэдыту ды яшчэ на жыццё засталося?

Так, у Еўрасаюзе многія бяруць крэдыты на адукацыю, такім чынам укладваючы грошы ў сваю будучыню. Але не варта забываць, што кошт навучання ў заходніх краінах значна вышэй, чым у нас, а працэнты па выплаце крэдытаў ніжэй. Сярэднестатыстычныя ж заробкі пакуль што таксама большыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Стракаты свет

# САМ САБЕ РЭЖЫСЁР... З «МАБІЛАЙ» У РУКАХ

## Стартаваў конкурс мабільнага кіно «MobilaArt»

**Яго ідэйным натхняльнікам выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. І, як абяцаюць арганізатары, лепшыя фільмы канкурсантаў пазней будуць размешчаны на спецыяльна створаным канале «MobilaArt» папулярнага інтэрнэт-рэсурсу YouTube. Галоўная ўмова — усе прадстаўленыя на конкурс работы павінны быць зняты выключна з дапамогай мабільнага тэлефона, а сюжэты для ролікаў кінематаграфісты-пачаткоўцы могуць прыдумаць самі або ўзяць з рэальнага жыцця.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У творчай моладзі будзе магчымасць праявіць сябе ў шасці намінацыях: «Мы + свет вакол нас», «Цуды прыроды», «Цудазвер», «Самае смешнае мабільнае кіно», «Актуальны рэпартаж» і «Мабільныя ідэі» . Удзел у конкурсе змогуць прыняць як работы моладзевых відэастудый, так і аўтарскія фільмы. Дапускаецца таксама ўдзел адразу ў некалькіх намінацыях.

Галоўная мэта праекта заключаецца ў падтрымцы моладзевых ініцыятыў і прадастаўленні таленавітай моладзі дадатковых магчымасцяў для самарэалізацыі, а таксама папулярызацыі навуковай і інавацыйнай дзейнасці сродкамі сучасных мабільных тэхналогій. Намінацыя «Мабільныя ідэі» разлічана якраз на стварэнне фільмаў пра навуковы ці навукова-даследчы погляд на розныя з'явы і сферы чалавечай дзейнасці: ад музыкі да матэматыкі, і ад фізікі да інфакамунікацый.

Фільмы для ўдзелу ў конкурсе «MobilaArt» будуць прымацца да 1 лютага 2013 года, а яго вынікі падвядуць на фестывалі ў Мінску. Больш падрабязная інфармацыя аб праекце размешчана на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Ахвяры «чырвонага пеўня»

### НЕ ПАКІДАЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ АДНЫХ...

**У Пухавіцкім раёне смяротную дозу чаднага газу на пажары атрымала маленькае дзіця. За жыццё яго брата змагаюцца медыкі...**

Трагедыя адбылася ў вёсцы Крыстамполле. Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, братоў трох і пяці гадоў бацькі пакінулі дома адных, а самі пайшлі на працу. У свабодным доступе для дзяцей знаходзіліся запалкі... Калі праз некаторы час дарослыя вярнуліся, яны ўбачылі, што з дома ідзе дым. Маці забегла ў жыллё і вынесла дзяцей з пакоя, які гарэў. Нягледзячы на ўсе намаганні дарослых, а таксама медыкаў хуткай медыцынскай дапамогі вярнуць да жыцця малодшае дзіця не атрымалася. Старэйшы брат знаходзіцца ў рэанімацыі ў цяжкім стане. За яго жыццё змагаюцца медыкі з дзіцячай абласной клінічнай бальніцы... Асноўная версія прычыны здарэння — дзіцячае свавольства з агнём. Малых сістэматычна пакідалі дома адных.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### «ВОГНЕННЫЯ» АЎТО

**У Полацку, на вуліцы Гагарына ў гаражным кааператыве «Дзвіна» ў выніку пажару ў гаражы згарэў «Масквіч-412». Як мяркуецца, прычына пажару — падпал. Вінаватага шукаюць супрацоўнікі гарадскога аддзела ўнутраных спраў.**

А ў абласным цэнтры на вуліцы імя Громава ў выніку пажару ў гаражы, прыбудаваным да драўлянага двухпавярховага дома, агнём былі пашкоджаны два аўто — «Кіа» і «Міцубісі». І ў гэтым выпадку, як мяркуюць спецыялісты, пажар адбыўся ў выніку падпалу. Гарэў і сам дом. Агнём былі знішчаны дах, стольнае перакрыцце, пашкоджаны маёмасць, сцены.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### НА СТАЯНЦЫ ГАРЭЛІ ГРУЗАВІКІ

**Пра тое, што на сталічнай вуліцы Чыгуначнай загарэліся грузавікі, пажарным-выратавальнікам ранкам паведамілі выпадковыя відавочцы.**

Калі на месца здарэння прыбылі падраздзяленні МНС, два грузавыя аўтамабілі ўжо гарэлі адкрытым полымем. Як потым высветлілася, напачатку адбылося загаранне ў маторным адсеку «МАЗ-МАН», які стаяў на адкрытай аўтастаянцы. Затым агонь перакінуўся на грузавік «Вольва», які стаяў побач. У выніку пажару пашкоджаным аказаўся «МАЗ-МАН» з адкрытым прычэпам, у «Вольва» полымя «прайшлося» па кабіне і часткова па закрытым прычэпе. Пры спробе самастойна патушыць пажар атрымаў апёкі твару і рук кіроўца аўтамабіля «МАЗ-МАН». 39-гадовага мужчыну даставілі ў бальніцу. Прычына здарэння высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** **(организатор аукциона)** **по поручению ЧУП «Молодечненский пищевой комбинат»** **(продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже объекта недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 62, в составе:**

**Лот № 1: павильон для хранения стеклобанки, инвентарный номер 630/С-4738, общей площадью 1895,3 кв.м.** Начальная цена с НДС – 2 982 127 320 бел. руб. Площадь земельного участка – **0,4913 га.** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.02.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.02.2013** до 12.00 по указанному адресу.

**Тел: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**



29 января 2013 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лунинецлес».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 20.10.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров.

*УНП 200251040*



Утерянный бланк строгой отчетности обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств – членов системы «Зеленая карта» серии BY/01/6951120 в количестве 1 шт. Представительство Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.**

*УНН 600013344*



**ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

**сообщает о проведении 6 марта 2013 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Свидно, ул. Центральная, д. 5А 623284605201000092 | 0,1500 | 11 144 700 | 2 514 910 |
| 2 | д. Свидно, ул. Центральная, д. 5Б 623284605201000090 | 0,1500 | 11 144 700 | 2 514 910 |
| 3 | д. Понизовье, пер. Заречный, д. 2А 623284604601000131 | 0,2459 | 17 429 884 | 2 514 932 |
| 4 | д. Силичи, ул. Центральная, д. 27Б 623284605401000285 | 0,1108 | 11 544 030 | 2 514 910 |
| 5 | д. Пархово, ул. Центральная, д. 25 | 0,2014 | 16 339 582 | 2 514 932 |

Земельные участки ограничений в использовании не имеют.

Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Аукцион состоится 6 марта 2013 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, ком. 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Последний день приема заявлений 28 февраля 2013 года до 17.00.

**Контактные телефоны: (801774) 54350, 55056, 55473.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 06 марта 2013 года проводит 3-ий открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности.**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 27 | Мастерская МРТС с ЭСД-20-ВЛ/230-Ч/400-М2 №1Р126221 1979 г. в составе: - ш. ЗИЛ-131 ш.343468 дв.880867 -ЭСД-20-ВЛ/230-Ч/400-М2 №790403812 на пр.2-ПН-2 ш.105858 4кат. 4277км | н.п.Новоколосово в/ч 25819 | 123 000 000 | 12 300 000 |
| 28 | Мастерская МТО-В № 07 на ЗИЛ-131 ш.536381 дв.889692 1984г. 3кат. 1 375 км | г.Гомель в/ч 63604 | 116 000 000 | 11 600 000 |
| 29 | Мастерская ПМ-2-70 №б/н 1973г. в составе: -МРМ №270 на ЗИЛ-131 ш.077201 дв.119707 1973г. 4кат. 17042км -МРС-АР №Л863 на ЗИЛ-131 ш.840011 дв.330785 1989г. 4кат. 1893км -ТА-5 №351029 на ш. ЗИЛ-131 ш.156154 дв.819621 1973г. 4кат. 18617км -ЭСБ-4-ВЗ №74091033 на пр.ТАПЗ(1-П-1,5) ш.б/н 1974г. 4кат. 18617км -АДБ-3122У1 №194402 на пр.ТАПЗ(1-П-1,5) ш.0306137 1973г. 4кат. 17042км | н.п.Новоколосово в/ч 25819 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 30 | Мастерская ПМ-2-70М №С35120 1985г. 3кт. в составе: -МРМ-М1 №280 на ш. ЗИЛ-131 ш.616024 дв.281852 1984г. 3кат. 3752км -МРС-АР №85070 на ш. ЗИЛ-131 ш.630512 дв.350837 1985г. 3кат. 6839км -ТА-5М №С35120 на ш.КамАЗ-4310 ш.007338 дв.686017 с ЭСБ-4-ВЗ-II-М1 №АИ23602317 1984г. 3кат. 9080км -АДБ3120У1 №С35120 на пр.1-П-2,5 ш.0446 1985г. 3кат. 15648км | г.Гомель в/ч 63604 | 155 000 000 | 15 500 000 |
| 31 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.107907014 дв.582349 1979г. 4кат. 7222км | г.Дзержинск в/ч 74962 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 32 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108001020 дв. б/н 1980г. 4кат. 3878км | г.Дзержинск в/ч 74962 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 33 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.107910035 дв.600829 1979г. 4кат. 2005км | г.Дзержинск в/ч 74962 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 34 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108003017 дв.623676 1980г. 4кат. 2018км | г.Дзержинск в/ч 74962 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 35 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш.108407060 дв.877182 1984г. 4кат. 2902км | г.Старые Дороги в/ч 48668 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 36 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш.140239 дв.548394 1990г. 3кат. 28789км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 37 | АТМЗ- 5-4320 (автотопливомаслозаправщик) с/о 1287 на УрАЛ-4320 ш.025314 дв.585752 1984г. 4кат. 59 650км 1089 м/ч | н.п. Михановичи в/ч 52188 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 38 | АЦ– 5,5–4320М (автоцистерна) с/о3658 на шасси УрАЛ-4320М ш.064966 дв.988834 1987г. 4 кат. 29339 км 518м/ч | н.п. Калинковичи в/ч 55461/2 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 39 | АТМЗ- 5-4320-1012 (автотопливомаслозаправщик) с/о3338 на УрАЛ-4320-1012 ш.075103 дв.074117 1987г. 4кат. 21935км 4 м/ч | н.п. Калинковичи в/ч 55461/2 | 150 000 000 | 15 000 000 |
| 40 | АТМЗ- 5-4320 (автотопливомаслозаправщик) с/о 2732 на УрАЛ-4320 ш.053135 дв.871562 1986г. 4кат. 58437км 361 м/ч | н.п.Михановичи в/ч 52188 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 41 | АТМЗ- 5-4320 (автотопливомаслозаправщик) с/о 1646 на УрАЛ-4320 ш.031898 дв.797252 1984г. 4кат. 9760км 2257 м/ч | н.п. Михановичи в/ч 52188 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 42 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш.065580 дв.987570 1986г. 4кат. 165531км | г.Борисов в/ч 19293 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 43 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш.158730 дв.681026 1990г. 3кат. 119104км | г.Слоним в/ч 33933 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 44 | Грузовой Урал-4320-0010-01 ш.172395 дв.771192 1991г. 3кат. 126000км | г.Слоним в/ч 33933 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 45 | Грузовой Урал-4320 ш.068932 дв.252142 1987г. 4кат. 157466км | г.Старые Дороги в/ч 48668 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 46 | Грузовой Урал-4320 ш.113184 дв.370276 1988г. 3кат. 155370км | г.Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 47 | Грузовой Урал-4320-0710-01 ш.087411 дв.178246 1987г. 3кат. 131489км | г.Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 48 | Грузовой Урал-4320-0011 ш.061014 дв.644879 1986г. 3кат. 142498км | г.Старые Дороги в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г.Минск, ул.Казинца, д.2, 6-й этаж, каб. № 637 **06 марта 2013г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **16.00 часов 01 марта 2013 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **06 марта 2013 г.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **10**-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 278-09-98, факс (017) 278-09-98. Наш адрес в интернете: www. belspeckontrakt.by.**

■ Цяжар славы

# ЗОЮ І ВАЛЕРЫЯ НАТХНІЛІ ПАЛЕСКІЯ ПЕСНІ І «МАШИНА ВРЕМЕНИ»

## Жыхары вёскі Зарэчча Бярозаўскага раёна Зоя і Валерый Барысюкі аднойчы прачнуліся знакамітымі

**Чаму так сталася, яны дагэтуль і самі добра ўсвядоміць не могуць. Усё было як звычайна: брат ездзіў на работу на завод «Цеплапрыбор», сястра рупілася па доме, даглядала сваю невялікую гаспадарку. А вечарамі, асабліва па святах, яны любілі паспяваць. Дома два баяны, два гармонікі — Валерый з любым музычным інструментам упраўляецца па-майстэрску. Ды і не дзіўна: у маладосці ён іграў у адным ансамблі з Андрэем Макарэвічам у горадзе Шахты Растоўскай вобласці.**



Зоя і Валерый на канцэрце раённай самадзейнасці за год да славы.

Вось і на гэты раз яны ад душы заспявалі для сваякоў, якія наведаліся з Расіі. Бавілі час у прыемнай кампаніі. Гаспадары і ведаць не ведалі, што госці іх здымалі і запіс будзе выкладзены ў інтэрнэце. Тым больш не ведалі, што колькасць праглядаў будзе расці кожны дзень, і з часам лік пойдзе на другі мільён — у іх жа камп'ютара дома не было! Гэта цяпер яны маюць ноўтбук, падораны каналам НТБ. А тады пра сваю славу са здзіўленнем даведаліся пасля званкоў мінскіх і маскоўскіх журналістаў.

Спачатку ролікі артыстаў з Зарэчча з'явіліся на «Шансон ТБ», потым іх паказалі ў вячэрнім эфіры АНТ. Пасля гэтага пасыпаліся прапановы ад розных расійскіх каналаў. Ужо два разы Зоя і Валерый з'ездзілі ў Маскву, удзельнічалі ў запісах перадач, для іх арганізоўвалі прэс-канферэнцыі сталічныя газеты. А потым ім тэлефанавалі ажно з Лондана — супрацоўнікі радыё ВВС. І хоць Барысюкі цяпер адказваюць не на ўсе тэлефонныя званкі, іх знаходзяць: гэтымі днямі ў Зарэчча прыехала здымачная група тэлеканала «Мір». Журналісцкія інтарэс і ўвага да вяскоўцаў выраслі настолькі, што 15 студзеня Зоя вымушана была звярнуцца да кардыёлага ў раённую паліклініку, а Валерый аб'явіў, што едзе адпачываць у санаторый за межы Беларусі. Яно і зразумела: не ўсякае сэрца вытрымае цяжар славы, тым больш калі гэта сэрца немаладога чалавека.

Няёмка называць Зояй жанчыну, якая мае пяцёра праўнукаў, — цяпер гэта яе сцэнічнае імя. Зоя Аляксандраўна Барысюк нарадзілася ў Драгічынскім раёне. Палескія песні слухала ў выкананні сваіх прабабулі і бабулі, спявала заўсёды, як сябе помніць. Жыццё, як яна цяпер нярэдка прызнаецца, пражыла нялёгкае. Першага мужа пахавала, з другім разышліся, перанесла дзве цяжкія хваробы. Толькі песня, паводле яе ж прызнання, заўсёды ратавала. А яшчэ яе вясёлы характар, яе ўменне ствараць вакол сябе станоўчую аўру. Да пенсіі жанчына працавала жывёлаводам, апошнія гады — даяркай. Зоя Аляксандраўна выконвае як народныя песні, так і тыя, якія складае сама. Ахвотна пяе частушкі, нават трохі вольнага зместу, «прыперчаныя». Вельмі любіць творчасць Ваенгі, лічыць блізкім сваёй душы сцэнічны вобраз спявачкі.

Валерый Аляксандравіч не дасягнуў пенсійнага ўзросту, ён яшчэ працуе. Большую частку жыцця пражыў у Расіі. У Беларусь вярнуўся восем гадоў таму. Для сястры Валерый стаў выдатным акампаніятарам.

Журналіст бярозаўскай раённай газеты Мікалай Сінкевіч, які суправаджаў дуэт у паездцы ў Маскву, сказаў, што за самадзейнымі артыстамі ён назірае даўно. Яны некалькі гадоў паспяхова выступаюць на раённых аглядах і конкурсах, іх запрашаюць на розныя канцэрты. Дома ў Барысюкоў шмат дыпломаў, грамат, іншых адзнак раённага аддзела культуры. Паводле слоў Мікалая, ён даўно прыглядаўся да сваіх вяскоўцаў, якія выклікаюць сімпатыю і адрозніваюцца асаблівай непасрэднасцю. Зоя вельмі эмацыйна жэстыкулюе, натуральна смяецца, дасціпная на язык, што разам з яе добрым голасам стварае асаблівую харызму. «Яны — сапраўдныя! Можа, гэта і прыцягнула інтэрнэт-наведвальнікаў, а таксама шматлікіх тэлевізійных дзеячаў», — разважае Мікалай Сінкевіч.

Песня Ваенгі, якую спявае Зоя Барысюк у кліпе, што прынёс ёй вядомасць, даступная да прагляду ўсім. Голас у нашай спявачкі, вядома, моцны. Але ж, як было заўважана, у сусветнай павуціне блукаюць сотні кліпаў розных самадзейных выканаўцаў. Чаму ўвагу звярнулі менавіта на бярозаўскіх спевакоў? Можа, таму, што яны не ведалі аб тым, што знаходзяцца перад камерай. Іншыя ж рэпеціруюць, стараюцца, хвалююцца і тым самым іграюць нейкую ролю. А Зоя сядзела на сваёй кухні ў дамашнім фартуху і спявала для гасцей і ўласнай душы.

А можа, сапраўды расійскія тэлевізійнікі і верны ім глядач стаміліся ад «фанернай» папсы, паказушнага гламуру і розных вычварэнняў, калі героямі дня становяцца маскоўскія дзеўкі, што апаганьваюць храм, альбо ўкраінскія феміністкі, якія голымі грудзямі рэагуюць на любую палітычную падзею? Можа, нават несвядома пацягнула мэтраў экрана да сапраўднага, нявыдуманага, няштучнага — да вытокаў? Таму і кінуліся здымаць палескую мажную сялянку, якая проста спявала песню і падумаць не магла, што яе кінуцца раскручваць, не шкадуючы сродкаў, не зважаючы на адлегласці. Дык і добра. У нас на Палессі галасістых людзей шмат. На ўсе каналы блізкага і далёкага замежжа хопіць. Няхай прыязджаюць, здымаюць, дыхаюць чыстым паветрам, чэрпаюць натхненне!..

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# БАЧЫЦЬ НАДЗЕЮ — ЗНАЧЫЦЬ ЖЫЦЬ



**Беларускае рэспубліканскае таварыства «Дзеці ў бядзе» ўжо 22 гады збірае сяброў на адмысловым свяце «Усмешка». Каля 700 чалавек прыйшлі ў сталічны Палац чыгуначнікаў, каб падзяліць радасць, падарыць усмешку адно аднаму і проста пагутарыць са старымі і новымі сябрамі.**







— Галоўная мэта арганізацыі — дапамагчы дзецям, якія хварэюць на анкалагічныя захворванні, выжыць. Я лічу, што ў дзяцей, і ў хворых, і ў здаровых, ёсць будучыня! І свята «Усмешка» гэта пацвярджае. Мы праводзім яго кожны год для таго, каб паказаць усім: жыццё не спыняецца. Нашы дзеці растуць, вучацца, становяцца спецыялістамі, ствараюць сем'і. Зала заўсёды поўная! Прыходзяць і тыя, хто ўжо дарослы, прыводзяць з сабой сваіх дзяцей. Збіраецца адна вялікая сям'я, — распавядае **спецыяліст па аздараўленні Беларускага рэспубліканскага таварыства «Дзеці ў бядзе» Алена ЛАГУТОВА**.

Акрамя цікавага прадстаўлення і добрых падарункаў, арганізатары мерапрыемства прэзентавалі новы праект. Зараз клініка не можа ўмясціць усіх дзяцей, таму ў планах пачаць сёлета будаўніцтва інтэрната для іншагародніх дзетак і іх бацькоў. Своеасаблівы гарадок будзе складацца з 22 дамоў, прычым кожны з іх разлічаны на дзве сям'і.

Павіншаваць дзяцей прыйшоў і пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Брус Бакнэл, а таксама прадстаўнікі дабрачынных арганізацый. У перапынках паміж творчымі нумарамі на сцэну выходзіў старшыня рэспубліканскага таварыства «Дзеці ў бядзе» Яўген Андрыевіч, які прааналізаваў леташнюю працу арганізацыі: «На жаль, год быў цяжкі ў фінансавым плане. І мы разглядалі варыянт нават не праводзіць «Усмешку». Але пасля таго, як бацькі яшчэ за некалькі месяцаў пачалі тэлефанаваць і пытаць, калі будзе мерапрыемства, мы зразумелі, што яно сапраўды патрэбна. Свята — гэта найперш стасункі. Гледзячы адно аднаму ў вочы, дзеці бачаць надзею, а гэта самае галоўнае».

**Надзея БУЖАН, фота аўтара.**

■ На варце закона

# КРЫМІНАГЕННАЯ СІТУАЦЫЯ Ў МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАЛЯПШАЕЦЦА

**Як вядома, за сухімі статыстычнымі лічбамі крымінальных зводак стаяць лёсы, а часам — і здароўе ці нават жыццё людзей. Так, органамі ўнутраных спраў Мінскай вобласці летась было зафіксавана амаль 17 тысяч дзеянняў, якія падпадаюць пад крымінальную адказнасць. У параўнанні з 2011 годам іх стала менш на чвэрць. Гэтыя лічбы былі агучаны на пасяджэнні калегіі УУС Мінаблвыканкама падчас падвядзення вынікаў леташняй працы. А лепшыя міліцыянеры атрымалі ўзнагароды.**

— Неабходна адзначыць добры ўзровень працы ДАІ. За чатыры гады аўтамабіляў на дарогах вобласці стала больш у разы. Але пры гэтым дарожна-транспартных здарэнняў рэгіструецца, наадварот, менш. Іх колькасць скарацілася да 1094 летась супраць 1582 за 2008 год. Былі затрыманы 9603 нецвярозыя кіроўцы. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгралі прафілактычныя акцыі «Пешаход», «Цвярозы вадзіцель», «Увага — дзеці!» і шэраг іншых, — мяркуе начальнік упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама Віктар Сянько.

Увогуле ў вобласці летась было зарэгістравана 450 тыс. выпадкаў парушэнняў правілаў дарожнага руху. Сумная пальма першынства належыць кіроўцам аўтамабіляў: 210 тыс. разоў яны парушалі хуткасны рэжым, а яшчэ 12,5 тыс. вадзіцеляў былі затрыманы без дакументаў. Пешаходы-парушальнікі трапілі ў поле зроку супрацоўнікаў ДАІ крыху менш за 34 тысячы разоў.

Рэзка скарацілася колькасць хуліганстваў — з 710 да 264. Крадзяжоў стала менш ва ўсіх без выключэння раёнах прысталічнай вобласці — амаль на чвэрць. Істотна радзей парушалі літару закона па лініі крымінальнага вышуку непаўналетнія — 532 разы пры 664 выпадках пазалетась.

— У мінулым годзе былі раскрыты ўсе згвалтаванні і выпадкі нанясення цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Акрамя таго, устаноўлены вінаватыя ў 320 злачынствах, здзейсненых у мінулым. З іх 37 адносяцца да катэгорыі цяжкіх і асабліва цяжкіх. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што кожнае нераскрытае злачынства — гэта моцны ўдар па рэпутацыі праваахоўных органаў у грамадстве. Бо давер да супрацоўнікаў міліцыі наўпрост залежыць ад якасці іх працы, — падкрэсліў Віктар Сянько.

А лепшыя ахоўнікі правапарадку вобласці атрымалі каштоўныя ўзнагароды. Адным з прызёраў стаў участковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Уздзенскага РУУС Яўген Барталевіч. Ён лічыць, што нельга працаваць толькі па шаблонах:

— Адбор канкурсантаў вёўся па шматлікіх крытэрыях як фізічнай, так і прафесійнай падрыхтоўкі. На мой погляд, сваю лепту ўнёс і мой вопыт працы з непаўналетнімі парушальнікамі закону. Раней ініцыятыва дыялогу зыходзіла пераважна ад міліцыянера. Зараз жа бацькі ўсё часцей самі звяртаюцца па дапамогу сваім дзецям. І гэта вельмі добра, бо любое злачынства куды лепш папярэдзіць, чым пасля разбіраць яго наступствы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Вольны час

# ХОД КАНЬКОМ

## Рэпартаж з чатырох папулярных сталічных каткоў

**Катанне на коньках сталічным жыхарам падабаецца. Калі паназіраць за тым, колькі народу адначасова знаходзіцца на катку ў самыя «гарачыя» для катання часы і колькі яшчэ чакае перад уваходам, складваецца ўражанне, што нават прыхільнікаў традыцыйнага «зімовага» адпачынку на канапе перад тэлевізарам хоць раз за сезон усё ж такі ўдалося паставіць на канькі. Сярод вялізнай колькасці варыянтаў (напрыклад, адкрыты каток, закрыты, загарадны ці ў межах Мінска) карэспандэнты «Звязды» абралі чатыры. Наведалі іх і вызначылі, дзе катацца найбольш танна, дзе найбольш зручны расклад, а дзе можна сустрэць самадзейную хакейную каманду.**





### ПУНКТ ПЕРШЫ.
### Каток лядовага Палаца спорту

Каб сюды трапіць, дастаткова пад'ехаць на метро да станцыі «Спартыўная», а пасля прайсці колькі метраў. Адна з першых пераваг, якую варта згадаць, — магчымасць пераабуцца ў канькі, седзячы на лаўках у цёплым памяшканні. У буфеце можна выпіць гарбаты з бутэрбродам ці чаго-небудзь яшчэ.

Час у лядовым палацы ў асноўным аддаецца хакейным матчам і трэніроўкам аматараў клюшкі і шайбы, а таксама юных фігурыстаў. Таму перад тым, як правесці гадзіну, катаючыся з задавальненнем, можна крыху паглядзець, як «круцяць» розныя там тодэсы і акселі.

Цяпер пра выдаткі. Сеансы катання на катку ў лядовым Палацы спорту розныя па працягласці. Калі вы трапляеце на той, што доўжыцца 45 хвілін, даросламу чалавеку давядзецца заплаціць 17 тысяч рублёў; дзіцячы квіток, на які маюць права асобы да 14 гадоў каштуе 12 тысяч рублёў. Узяць напракат канькі можна за такую ж суму.

Пакатацца на працягу 1 гадзіны 15 хвілін даросламу будзе каштаваць ужо 24 тысячы рублёў, дзіцяці — 18 тысяч рублёў. Канькі ў такім выпадку «выцягнуць» з кашалька 16 тысяч рублёў.

Шляхам няцяжкіх матэматычных падлікаў вызначаем, што, калі каток у лядовым Палацы спорту вырашыць наведаць дарослы чалавек без дзяцей і ўласных канькоў, яму прыйдзецца аддаць 29 тысяч альбо 40 тысяч рублёў.

Той, хто наведвае каток пастаянна, можа набыць у касе абанемент. Тут ёсць тры варыянты: дарослы на 10 наведванняў — 165 тысяч рублёў, такі ж, але дзіцячы — 115 тысяч рублёў, і дзіцячы плюс дарослы, але ўжо толькі на 5 наведванняў — 140 тысяч рублёў.

Калі казаць пра якасць лёду, то тут можна разлічваць на самае лепшае, паколькі гэтае месца падыходзіць для прафесійнага спорту. Адзіны нюанс, пра ўдакладненне якога варта паклапаціцца загадзя, — час, на які прыпадае масавае катанне ў лядовым палацы. Расклад кожны раз карэктуецца. Той, які давялося пабачыць пры наведванні нам, распавядаў, што на працягу ўсяго тыдня пакатацца ёсць магчымасць выключна пасля дзевяці гадзін вечара. І толькі ў нядзелю першы сеанс пачынаецца ў 17.45.

### ПУНКТ ДРУГІ.
### Каток на Кастрычніцкай плошчы

Моц лёду гэтага катка журналісту нашай газеты давялося выпрабаваць уласнымі нагамі, а дакладней — каленямі, якія доблесна ўратавалі ад поўнага распластавання.

Уваход на лёд бясплатны, а канькі на Кастрычніцкай каштуюць так: да 34-га памера — 15 тысяч рублёў, большыя — 25 тысяч.

Давялося выдаткаваць 25 тысяч рублёў і выправіцца на коўзкае палатно катка. Вечарам народу было шмат. Міма з хуткасцю Плюшчанкі праносіліся хлопцы, дзяўчаты і нават дзядулі, а таксама малыя дзеці, якія смела прашмыгвалі некуды ў глыб натоўпу.

Спачатку, як ужо было сказана, я ўпала. Адразу ж, як ступіла на лёд. Па-першае, «фігурыст» з мяне яшчэ той, лянівы і павольны, а па-другое — па лёдзе адкрытага катка, зацярушаным крыху снегам і дзе-нідзе добра пашкоджаным, катацца ўсё ж цяжэй, чым па роўным і гладкім «люстэрку» на крытых катках.

Праз колькі часу ўдалося прызвычаіцца, і пачаць слізгаць крыху больш упэўнена. Так адолела круг-другі, збочыла крыху да сярэдзіны і трапіла каньком на выбоіну, досыць вялікую, з-пад якой праглядвалася плітка. Пасля запомніла гэтае месца і аб'язджала яго за некалькі метраў. Так пайшоў пяты ці чацвёрты круг катання ў адмысловым «аўтарскім» стылі. Я ўжо збіралася пайсці з катка, як раптам... Шчыра кажучы, я спачатку і не зразумела, што гэта ў хакей гуляюць. Але калі вакол мяне пачалі насіцца падлеткі без канькоў, затое з клюшкамі, і ледзьве не з-пад ног выбіваць шайбу, я пераканалася, што яно так і ёсць. Неяк выбралася адтуль і зразумела, што час катання акурат падыходзіць да заканчэння. Пайшла скідаць канькі, але ўбачыла, што месца на лаўках чакаць прыйдзецца доўга. Больш эфектыўным падалося на свае страх і рызыку прайсціся ў каньках да прыступак Палаца Рэспублікі, дзе месца было значна больш.



### ПУНКТ ТРЭЦІ.
### Крыты каток на Нямізе

Гэта, відаць, самае папулярнае месца для катання ў горадзе. Нават у будзённыя дні, як толькі пачынае працу гэты каток, абавязкова збіраецца дзясятак-другі наведвальнікаў.

Што зручна, тут прадугледжана камера захоўвання, дзе пры наяўнасці чэка за аплачаны сеанс катання можна пакінуць свае рэчы абсалютна бясплатна і не турбавацца, што нехта на іх паквапіцца. На Нямігу звычайна прыходзіць катацца шмат народу, таму некаторым, асабліва ў выхадныя, даводзіцца чакаць. Пакуль час ідзе, можна сагрэцца кубачкам кавы з аўтамата. Плюс катка яшчэ і ў тым, што лёд штодзень шліфуецца, таму катацца, нават навічкам у гэтай справе, па роўнай гладкай лядовай паверхні значна лягчэй.

Уваход на каток да 15.45 каштуе 10 тысяч рублёў, пазней прыйдзецца аддаць на 5 тысяч больш. Канькі для ўладальнікаў ног да 35 памера абыдуцца ў 10 тысяч рублёў. Ногі большыя давядзецца абуваць ужо за 15 тысяч рублёў за пару. Значыць, пры самым «неэканомным» раскладзе, калі на каток пасля 15 гадзін дня ідзе чалавек з вялікім памерам нагі, прыйдзецца пакінуць у касе 30 тысяч рублёў.

Калі не надта верыце, што ў вас ёсць скрытыя здольнасці фігурыста, на гэтым катку вас чакае адна прыемнасць — борцікі, за якія можна трымацца, наварочваючы круг за кругам. Вядома ж, сказана несур'ёзна, а вось што сапраўды можа прыйсціся дарэчы, калі вы на каньках ніколі дагэтуль не стаялі, — гэта навучанне катанню. 45 хвілін інструктажу для дарослых каштуе 35 тысяч, а для дзяцей — 20 тысяч рублёў. На навучанне таксама можна набываць абанементы.

А самы позні сеанс катання на Нямізе заканчваецца ў 22.45.

### ПУНКТ ЧАЦВЁРТЫ.
### Каток каля Нацыянальнай бібліятэкі

Прызнацца, пра тое, што ён там ёсць, мы раней толькі чулі, але спецыяльна ніколі катацца туды не ездзілі. Увогуле, пляцоўка каля бібліятэкі — у любым сэнсе месца «падветранае» цягам усяго года, а ўзімку — асабліва, што адразу і адчулася. Хутаючыся ў куртку, закруціўшыся ў капюшон, апошняе, што хацелася — стаць на канькі і апынуцца на лёдзе. Відаць, калі ўжо адважыўся выйсці на гэты каток, то тут варыянты два — альбо захутацца з галавы да ног, пакінуўшы «агаленымі» толькі вочы, альбо так катацца, каб ніякі холад не прычапіўся.

Лёд каля бібліятэкі на выгляд месцамі нейкі рабрысты. Відаць, нешта падтала ці было выбіта канькамі заядлых аматараў катання. Затое катацца, калі ёсць свае канькі, можна абсалютна бясплатна. Узяць канькі напракат каштуе 20 тысяч рублёў. Побач таксама ёсць кіёск, дзе можна купіць печыва, каб падсілкавацца. Пракат працуе з 12 гадзін у будзённыя дні (і з 10.00 — у выхадныя) да 22 гадзін вечара. Кошт катання тут адзін з самых «бюджэтных», але, каб пераабуцца ў канькі, трэба памарозіць ногі. Ды і лавак, каб прысесці, тут не шмат.

Але, як расказваюць жыхары раёна, вечарамі на гэты каток наведваецца нямала людзей. У асноўным, праўда, са сваімі канькамі. Зручна ў першую чаргу таму, што не трэба ехаць катацца далёка ад дома і плаціць грошы. Ну і вядома тое, што прыйсці, калі маеш свае канькі, можна ў любы час, прычым не трэба абмяжоўваць сябе пачаткам і заканчэннем сеансаў катання.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

**Дарэчы!**

*Канькі даспадобы не ўсім. Многія абіраюць катанне на лыжах ці яшчэ лепш — на санках, дзе галоўнае — знайсці добрую горку і паспяхова на яе ўзабрацца. Мы пацікавіліся, ці можна ў Мінску ўзяць напракат лыжы ці санкі і колькі гэта будзе каштаваць. У адной з сетак пракату сталіцы нам паведамілі, што лыжы за суткі каштуюць 18 тысяч рублёў, калі гэта лыжы паўпластыкавыя, і 24 500 рублёў, калі жадаеце ўзяць поўнасцю пластыкавы інвентар, які лічыцца больш якасным. Узяць у арэнду звычайныя дзіцячыя санкі можна ўсяго за 2 тысячы рублёў у суткі. А вось модныя цяпер цюбінгі, прыстасаванні для катання з горак па снезе, падобныя да надзіманых гумавых лодак, можна арандаваць за 50-70 тысяч рублёў на суткі.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков в г. Лида в частную собственность

**Аукцион состоится в 12.00 19 февраля 2013 г. в г. Лида Гродненской обл. по ул. Советской, 8.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**
**Последний день приема заявлений – 15 февраля 2013 г. до 15.00.**
**Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by**

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, ул. Летная, У-1177 423650100013002001 | г. Лида, ул. Летная, У-1178 423650100013002000 | г. Лида, ул. Г. Беды, У-1171 423650100013002003 | г. Лида, ул. 5 Декабря, У-184 423650100005000949 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1496 | 0,1423 | 0,1295 | 0,1045 |
| Форма участка | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная |
| Рельеф участка | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный |
| Расположение земельного участка | земельный участок расположен в юго-восточной части города | земельный участок расположен в юго-восточной части города | земельный участок расположен в юго-восточной части города | земельный участок расположен в северо-восточной части города |
| Расположение участка в массиве застройки | угловой | угловой | угловой | не угловой |
| Транспортная доступность | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Малахова, автобусы №№ 5, 6 приблизительно составляет 400 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Малахова, автобусы №№ 5, 6 приблизительно составляет 370 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Г. Беды, автобусы №№ 5, 6 приблизительно составляет 100 м | расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова, автобус № 3 приблизительно составляет 500 м |
| Инженерная инфраструктура | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, водопровод, канализация, газопровод с условиями. Необходимо произвести вынос газопровода, попадающего в границы участка и компенсировать стоимость строительства уличного распределительного газопровода | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, водопровод, канализация, газопровод с условиями. Необходимо произвести вынос газопровода, попадающего в границы участка и компенсировать стоимость строительства уличного распределительного газопровода | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, водопровод, газопровод с условиями. Необходимо компенсировать стоимость строительства уличного распределительного газопровода к жилым годам №№ 44, 46 в г. Лида по ул. Калинина | существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод, водопровод, канализация с условиями |
| Экологическое состояние | благоприятное | благоприятное | благоприятное | благоприятное |
| Наименование ограничений в праве | в охранных зонах сетей и сооружений канализации площадью 0,0005 га | в охранных зонах сетей и сооружений канализации площадью 0,0021 га | в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения площадью 0,0340 га | в охранных зонах линий электропередачи площадью 0,0330 га; в охранных зонах сетей и сооружений канализации площадью 0,0112 га; в водоохранных зонах водных объектов площадью 0,1045 га |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 107 037 454 (сто семь миллионов тридцать семь тысяч четыреста пятьдесят четыре) рубля | 101 814 370 (сто один миллион восемьсот четырнадцать тысяч триста семьдесят) рублей | 99 328 184 (девяносто девять миллионов триста двадцать восемь тысяч сто восемьдесят четыре) рубля | 52 098 475 (пятьдесят два миллиона девяносто восемь тысяч четыреста семьдесят пять) рублей |
| Задаток, руб. | 10 703 750 | 10 181 440 | 9 932 820 | 5 209 850 |
| Дополнительное условие | возместить затраты: за разработку проектно-сметной документации генерального плана-схемы в сумме 377 012 рублей; за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 231 481 рублей; за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей. Участок предоставляется с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности. | возместить затраты: за разработку проектно-сметной документации генерального плана-схемы в сумме 377 012 рублей; за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 128 046 рублей; за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей. Участок предоставляется с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности. | возместить затраты: за разработку проектно-сметной документации генерального плана-схемы в сумме 377 012 рублей; за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 3 009 898 рублей; за государственную регистрацию создания земельного участка 490 000 рублей; по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 510 170 рублей | возместить затраты: за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 530 000 рублей; по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 691 200 рублей |

Условия проведения аукциона в части продажи земельных участков в частную собственность.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания земельного участка;

осуществить в двухмесячный срок государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;

получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;

приступить к занятию земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявление в соответствии с действующим законодательством.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 5%.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;

доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков – р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка/кадастровый номер | Кадастровый номер 1401000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | р-н индивидуальной застройки «Козловичи» № 335 по ГП | 1026919 | 0,1193 | для строительства и обслуживания жилого дома | **58 913 919** | 11 780 000 | 913 395 | ограничений в использовании земель нет |
| 2* | ул. Железнодорожная, 7/1 | 1027088 | 0,1304 | | **219 708 482** | 43 940 000 | 917 769 | 0,0049 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 3* | пер. Железнодорожный 4-й, 21 | 1027087 | 0,1207 | | **201 421 384** | 40 280 000 | 1 233 994 | ограничений в использовании земель нет |
| 4* | ул. Красногвардейская, 36 | 1027451 | 0,1185 | | **179 111 328** | 35 820 000 | 2 834 194 | 0,0058 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 0,4 кВ |
| 5 | ул. Фортечная, 90 | 1027692 | 0,0967 | | **149 307 894** | 29 860 000 | 4 267 157 | ограничений в использовании земель нет |
| 6 | ул. Полоцкая, 2 | 1027648 | 0,1194 | | **97 354 820** | 19 470 000 | 3 248 546 | 0,1194 га – водоохранная зона пруда |
| 7 | ул. Ясногорская, 14/2 | 1027650 | 0,1299 | | **37 691 394** | 7 530 000 | 300 000 | 0,0124 га – охранная зона линии связи и радиофикации |
| 8 | пер. 2-й Ясногорский, 13 | 1024180 | 0,1088 | | **31 569 082** | 6 310 000 | - | ограничений в использовании земель нет |
| 9** | участок № 63 в р-не Березовка-Задворцы (КИЗ № 5) | 1027649 | 0,1023 | | **59 542 283** | 11 900 000 | 300 000 | ограничений в использовании земель нет |

***** – повторные аукционные торги*
***** – сумма паевого взноса, подлежащая возмещению бывшему члену КИЗ № 5, – 8 265 817 руб.*

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**
• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников); • в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения горисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;
• приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство).

**Аукцион состоится 21 февраля 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 17.01.2013 г. до 17.30 15.02.2013 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46 (либо ул. Ленина, 50).**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

---

28 января 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда и номинальной стоимости акций ОАО «Полесьежилстрой».
2. О внесении и утверждении изменений в устав общества.
3. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 20.01.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200050191

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**
**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**
**о строительстве жилых помещений объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 8 по генплану» в г. Минске,**
*опубликованную в газете «Вечерний Минск» 26 ноября 2010 года:*

**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – январь 2013 года.**

Дополнительные соглашения о переносе сроков окончания строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. Орше

| № п/п | Место-расположение и площадь земельного участка | Начальная цена продажи (руб.) | Условия заключения договора аренды | Инженерное обеспечение земельного участка | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право заключения договора аренды земельного участка по ул. Грицевца в г. Орше площадью 0,0572 га. Кадастровый номер 242400000001012962 | 862 496 | Срок договора – 10 лет. Целевое использование – для строительства шиномонтажа, автомойки, автосервиса. | В квартале застройки по ул. Грицевца, где расположен земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, газоснабжения, телефонной и электрической связи. Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с его расположением в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, участок находится в санитарно-защитной зоне, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется. | 86 250 |

1. **Аукцион состоится в 11.00 19 февраля 2013 г. в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.**

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагается документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911, с отметкой банка, а также представляются:

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина или индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенная доверенность;

*представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

*представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

*представителем иностранного гражданина* – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены продажи предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, обязан:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;
- не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе о результатах аукциона, заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся, обратиться за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

5. **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2, кабинет 18 (сектор по управлению госимуществом и приватизации управления экономики Оршанского горисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 13 февраля 2013 года включительно.**

**Контактные телефоны в г. Орше: (8-0216) 21-13-14, 21-12-42. Осмотр земельного участка на местности – контактный телефон в г. Орше: (8-0216) 44-40-32.**

---

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка/кадастровый номер | Кадастровый номер 1401000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Морозова | 1027694 | 0,1047 | строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей | 10 | **45 382 153** | 9 075 000 | 5 939 614 | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | ул. Высоковская | 1027693 | 0,4733 | строительство и обслуживание объекта питания с общественно-бытовыми помещениями | 10 | **585 110 847** | 117 020 000 | 5 941 339 | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | ул. Тришинская | 1027695 | 0,0281 | строительство и обслуживание объекта шиномонтажа | 10 | **17 422 976** | 3 480 000 | 6 122 683 | 0,0281 га – водоохранная зона р. Мухавец, 0,0013 га – охранная зона подземной линии электросвязи, 0,0031 га – охранная зона сетей и сооружений газопровода |
| 4* | на пересечении ул. Вульковская и ул. Рябиновая | 1027543 | 0,1426 | строительство и обслуживание объекта общественного питания | 10 | **203 682 515** | 40 736 000 | 4 324 574 | ограничений в использовании земель нет |
| 5* | на пересечении ул. Врублевская и ул. Пуганова | 1027541 | 0,5276 | строительство и обслуживание объекта торговли | 10 | **591 893 796** | 118 378 000 | 4 355 924 | ограничений в использовании земель нет |
| 6* | № 54 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-2» | 1027363 | 0,6175 | для строительства и обслуживания торгово-офисного центра | 10 | **474 823 760** | 94 960 000 | 3 337 308 | ограничений в использовании земель нет |
| 7* | ул. Октябрьской Революции (по ГП № 61 в микр. «ЮВМР-1») | 1013899 | 0,4100 | строительство и обслуживание жилого многоквартирного дома с элементами повышенной комфортности со встроенными многофункциональными объектами (социально-культурного назначения и торговли) | 10 | **439 781 964** | 87 950 000 | 133 823 | ограничений в использовании земель нет |
| 8* | № 6 (по ГП) согласно ПДП «Вычулки-Ямно» | 1027196 | 0,0748 | строительство и обслуживание объекта торговли и общественного питания | 10 | **40 602 030** | 8 120 000 | 2 627 392 | ограничений в использовании земель нет |
| 9* | ул. Речицкая | 1027193 | 0,0020 | установка и обслуживание торгового павильона в комплексе торговых павильонов | 10 | **2 659 229** | 530 000 | 2 428 862 | ограничений в использовании земель нет |
| 10* | ул. Мошенского | 1027197 | 0,0100 | установка и обслуживание торгового павильона | 10 | **11 775 636** | 2 355 000 | 1 665 677 | ограничений в использовании земель нет |
| 11* | «ЮЗМР-4» № 18а по ГП | 1022681 | 0,1234 | строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров | 10 | **149 641 293** | 29 920 000 | 755 221 | ограничений в использовании земель нет |
| 12* | в районе ул. Волгоградская | 1025064 | 0,2967 | строительство и обслуживание спортивных сооружений | 10 | **349 687 080** | 69 930 000 | 1 306 845 | ограничений в использовании земель нет |
| 13* | р-н Южного городка № 21 по ГП | 1025533 | 0,4439 | строительство и обслуживание магазина промышленной группой товаров | 10 | **456 968 279** | 91 390 000 | 1 199 309 | ограничений в использовании земель нет |
| 14* | ул. М.Л. Мошенского | 1025787 | 0,9446 | строительство и обслуживание автостоянки | 10 | **1 112 326 560** | 222 460 000 | 1 513 733 | 0,0060 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 15* | ул. Базановой, 4 | 1026802 | 0,0187 | установка и обслуживание объекта торговли | 10 | **25 229 392** | 5 045 000 | 1 407 198 | 0,0032 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000В; 0,0056 га – охранная зона водопровода |
| 16* | ул. Ясеневая | 1027467 | 0,1490 | строительство и обслуживание магазина непродовольственной группы товаров | 10 | **135 402 979** | 27 080 000 | 3 932 071 | ограничений в использовании земель нет |
| 17* | ул. Красногвардейская | 1026816 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 1 | 10 | **3 726 746** | 745 000 | 1 529 617 | 0,0002 га охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 18* | ул. Красногвардейская | 1026817 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 2 | 10 | **3 726 746** | 745 000 | 1 001 905 | 0,0021 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 19* | ул. Красногвардейская | 1026818 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 3 | 10 | **3 726 746** | 745 000 | 1 001 905 | ограничений в использовании земель нет |

** – повторные аукционные торги*

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** - легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881;

• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;

• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;

• приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 21 февраля 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 17.01.2013 г. до 17.30 15.02.2013 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46 (либо ул. Ленина, 50).**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 1 (459)



### ЧАМУ ПАДЧАС ЗАХОЎВАННЯ МОРКВА СТАНОВІЦЦА ГАРКАВАЙ?

**Здараецца, што морква, захоўваючы свой свежы выгляд, на смак гаркаватая. Гэтыя непрыемныя смакавыя якасці з'яўляюцца з-за таго, што падчас росту верхавіны караняплодаў агаліліся і на святле пазеляненелі. У гэтым выпадку ў іх утвараецца алкалоід саланін, які пры захоўванні паступова пранікае ў моркву і робіць яе горкай.**

Каб гэтага не адбылося, падчас фарміравання караняплодаў неабходна праводзіць рыхленне з абганяннем, каб морква была прыкрыта зямлёй. Але калі караняплоды пазелянелі, верх лепш зразаць. Калі месцы зрэзаў прысохнуць, апрацуйце іх растворам часнаку і пaскладайце ўраджай на захоўванне.

Вельмі добра захоўваецца морква такіх гатункаў, як Ласінаастроўская, Шантанэ, Флакара.

## ЗАКОНЫ СТВАРЭННЯ КВЕТНІКАЎ: ПРЫГАЖОСЦЬ БЕЗ АХВЯР

**Падыход да стварэння кветнікаў павінен абапірацца на закон трох «э»: экалогія, эканоміка, эстэтыка. Як ні дзіўна, прыярытэты расстаўляюцца менавіта ў такім парадку. Будзеце вы праводзіць у садзе ўвесь вольны час ці станеце ўладальнікам «кветніка выхаднога дня», які патрабуе мінімальнай працы, залежыць ад дакладнай ацэнкі экалагічных умоў на ўчастку.**

Як бы мы ні імкнуліся памяншыць ці павялічыць вільготнасць глебы, павялічыць колькасць перагною, змяніць умовы асветленасці, прырода ўсё адно паспрабуе аднавіць «парушанае» і з часам верне нас на зыходныя пазіцыі. Акрамя таго, усё гэта патрабуе сродкаў і часу.



Вялікае значэнне мае вільготнасць глебы. У знакамітым «сухім» садзе Бэт Шато ў Англіі ўсе расліны паліваюцца толькі адзін-два разы ў жыцці — пасля пасадкі. У астатні час яны атрымліваюць толькі натуральную вільгаць. Несумненна, гэты сад — эксперымент, дзе створаны цвёрдыя ўмовы натуральнага адбору. Нам падобнае не трэба: падчас засухі нават у самых вынослівых раслін адмірае надземная маса, і сад аднаўляе дэкаратыўнасць толькі ў верасні, падчас восеньскіх дажджоў. Таму ў вашым сухім кветніку расліны пры неабходнасці будуць палівацца — галоўнае, што пры правільным іх выбары, у адпаведнасці з вільготнасцю глебы, рабіць гэта трэба будзе толькі зрэдку.

Сухія пясчаныя глебы патрабуюць паляпшэння. У сухім садзе пад кожную расліну пры пасадцы робім ямку і запаўняем яе сумессю ўрадлівай зямлі на аснове кампосту. Гэта павялічвае не столькі ўрадлівасць глебы, колькі яе вільгацяёмістасць. У такіх умовах выдатна сябе адчуваюць палын, чабор, розныя расходнікі, каменяломнікі, малачаі, ліхнісы, кацямяткі, амсоніі, катран.



Калі на ўчастку пераважаюць гліністыя глебы, якія добра ўтрымліваюць вільгаць, спачатку давядзецца папрацаваць над паляпшэннем іх структуры. Спецыялісты лічаць, што ў гліну, якая заплывае, лепш не ўносіць арганіку — трэба толькі разрыхліць яе дробным жвірам і пакінуць у спакоі, а ўрадлівы пласт стварыць шляхам падсыпкі зверху кампосту, пяску, торфу і іншых лёгкіх кампанентаў глебы.

Моцна пераўвільготненыя глебы маюць патрэбу ў асушванні. Шмат працы? Несумненна, але папрацаваць давядзецца толькі адзін раз. На палепшаных вільготных глебах выдатна развіваюцца пельтыфілум шчытападобны, прымулы, лотаць балотная, валжанка, некаторыя віды касача.

У сапраўдным «кветніку выхаднога дня» давядзецца адмовіцца ад відаў, якія для звычайнага развіцця маюць патрэбу ў частых (раз у 3-4 гады) перасадках: прымул, касачоў барадатых. Калі вы не ўяўляеце сабе кветніка без гэтых раслін, вылучыце пад іх як мага менш плошчы ў самых даступных месцах, куды лёгка дабрацца без рызыкі пашкодзіць суседнія пасадкі. Да 10 гадоў на адным месцы могуць расці валжанкі, хосты, анемона японская і лясная, лілейнікі, варанец. Варта выдаткаваць час на пошук такога асартыменту, каб пасля любавацца на вынік сваёй працы не 5-6 гадоў, а 10 і больш. На жаль, не месца тут раслінам, якім патрабуецца падвязка з-за сваёй вышыні (дэльфініум культурны) ці тым, у якіх распадаюцца кусты (шматгадовыя астры, геленіумы).

Звярніце ўвагу на ўмовы асветленасці. Наўрад ці асцільбы, васіліснікі і прымулы будуць выдатна развівацца на сонечных участках, а флёкс шылавідны, скочкі і хрызантэмы карэйскія — у цені.

Праўда, калі дэльфініуму ў «кветніку выхаднага дня» сапраўды рабіць няма чаго (агратэхніка складаная, часта хварэе, ды і перасадкі патрабуе кожныя 5-6 гадоў), то для іншых высакарослых відаў англічане прыдумалі спосабы падвязкі без прыцягнення ручной працы. Можна скарыстацца галінкамі дрэў: іх утыкаюць у глебу вакол высаджаных раслін так, што яны ўтвораць натуральную сістэму мацавання. А можна зрабіць каркас з пластыкавай сеткі і замацаваць яго з дапамогай драўляных палачак вертыкальна — у выглядзе цыліндраў — ці гарызантальна — у выглядзе полага вызначанай вышыні. Такая канструкцыя ствараецца на некалькі гадоў у момант пасадкі раслін. Увесну парасткі праходзяць паміж вочак сеткі ці паміж галінкамі і захоўваюць вертыкальнае становішча на працягу ўсяга сезона.

Жаданымі гасцямі ў нашым кветніку будуць шматгадовыя і двухгадовыя расліны, якія даюць самасеў. У гэтым выпадку нам застанецца толькі штогод выдаляць лішнія сеянцы. Структура такога кветніка можа змяняцца: летась наперстаўкі давалі вертыкальныя акцэнты ў адным месцы, а сёлета — зусім у іншым. Для «кветніка выхаднога дня» проста створаны незабудкі, званочак персікалістны, дзіванна, стакроткі, аквілегія, лубіны.

Каб надаць кветніку структуру, можна і трэба выкарыстоўваць кусты. Выбар іх таксама будзе залежаць ад экалагічных умоў. Аддавайце перавагу тым, якія прыгожа цвітуць (гартэнзіі, спірэй, дуброўкі) ці маюць дэкаратыўнае лісце (барбарысы).

Каб як мага менш часу марнаваць на прапалку, трэба старанна падрыхтаваць месца пасадкі. Глебу не толькі перакопваюць, але і абавязкова чысцяць ад пустазелля. Калі яго вельмі шмат, можна скарыстацца гербіцыдамі, а каб не даць пустазеллю магчымасці вярнуцца ў кветнік, неабходна выкарыстоўваць мульчу (як на сухіх, так і на вільготных глебах). Правіла такое: ці ўвесь пляц кветніка засаджваецца раслінамі, аж да таго, што любыя вольныя месцы аддаюцца глебапакрыўным культурам, ці выкарыстоўваецца мульча — напрыклад, драўняная дранка (таўшчыня слоя не менш за 5 см).



Дэкаратыўнасць простага ў доглядзе кветніка, несумненна, на аматара: у ім не будзе пышных вяргіняў, руж, дэльфініумаў, гатункавых лілейнікаў; хутчэй за ўсё, ён не падыдзе для парадных месцаў. Але ён незаменны для гультаяватых (у добрым сэнсе) садоўнікаў, якія прыязджаюць за горад для адпачынку, а не для цяжкіх садовых работ. Аддавайце кветнікам столькі часу, колькі будзе вам у радасць.

■ Экслібрыс «Звязды»

## З КАГОРТЫ ПУРПУРАРОДНЫХ

*Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі : факсімільнае выданне / прадм. А. Сушы. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2012. — 814 с.*



Гэтую кнігу шукалі, як папараць-кветку.

Лазілі па гарышчах і сутарэннях, пераадольвалі межы самых розных рэспублік, выпрошвалі і не вярталі.

Гэты фаліянт быў найдаражэйшым падарункам і для аматара, і для бібліяфіла-прафесіянала; гэтую кнігу творцы беларушчыны перадавалі, як сямейны абраз, ад пакалення да пакалення — таму, хто варты.

Ад яе веяла крамолай, таямніцай, нетутэйшасцю.

Сёння «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі» Вацлава Ластоўскага можа купіць кожны, хто пераадолее сваю прыродную беларускую скнапнасць (цана засталася «падарункавай») і зробіць крок да бліжэйшай кнігарні.

З'ява часткова дэсакралізавалася.

Часткова — бо цалкам Ластоўскі дэсакралізавацца не можа апрыёры. Усё, што зроблена ім, няхай гэта філасофскія верлібры, дэтэктыўна-містычныя «Лабірынты», крытычныя артыкулы, пераклады, наватарскія перакладныя слоўнікі, часопісныя арт-праекты, этнаграфічныя трактаты, мовазнаўчыя зацемкі, падручнікі, музеязнаўчыя і кнігазнаўчыя перспектыўныя планы і распрацоўкі — усё гэта напісана ў рэчышчы нейкай ідэальнай і ў той жа час сінкрэтычнай нацыянальнай культуратворчасці. «Ластоўскіяна» заўсёды ішла, як раней пісалі, «у дыскусійным парадку» — змагалася са стэрэатыпамі, давала перспектыву для мыслення, рабіла апісанне зробленага папярэднікамі, у выніку якога выяўлялася, што гаварыць «а беларусы нікога ж не маюць» — прынамсі, неэтычна.

Выяўляецца, маюць. І багата.

Той забыты набытак мігціць у пярсцёнку на пальцы земскага пісара ў «Вянку» Багдановіча, у каўшах з віном падчас абрадавай вячэры старажытных духаў з паэмы Купалы «На Куццю». Гэтая пазачасавая Беларусь была патрэбна як паветра ў 1910-я гады, калі культура магла згарнуцца ў мястэчковы эрзац і замкнуцца ў самой сабе. Дзякуючы невысокаму чалавеку з вострай бародкай гэтага не адбылося.

Ластоўскі вярнуў літаратуры і навуцы Беларусі часавае і пазачасавае. Вярнуў належнае, раней адабранае. У прадмове да кнігі ён пісаў:

«Няма больш занядбанай дзедзіны ў светавой пісьменнасці, як гісторыя паняволеных народаў. Вышэйсказанае асабліва кідаецца ў вочы, калі ўзяць якую-колечы галіну нашай, крыўскай, гісторыі. То знача гісторыі народу, каторы, не так яшчэ даўно, жыў сваім самаістым палітычным і культурным жыццём. Супярэчнасць між сведчаннем гістарычных помнікаў і асвятленнем іх сучаснай пісьменнасцю проста паражаючая. Беручы ў рукі гістарычную кнігу часовых нашых пераможцаў, не ведама чаму больш дзівіцца, ці іх бескрытычнасці, ці паражаючай умеласці тэндэнцыйна выкарыстываць аб'ектыўныя сведчанні гісторыі... Гісторыя дагэтуль была служкай палітыкі пануючых дынастый і дзяржаў... Ясна, што пры гэтакай гісторапісі, у якіх сто гадоў, паняволеныя народы аказываліся не толькі, саўсім праўна, абяспраўленымі, але і пазбаўленымі сваей слаўнай мінуўшчыны. Шчаслівыя пераможцы лепшыя балоны гісторыі паняволенага брата ўпісывалі ў сваю гісторыю. І колішні патульны сусед ці нават васал, прыбраўшыся ў здзерты з плеч заняпаўшага пурпур, станавіўся "пурпурародным„».

Вернуты законнаму ўладальніку пурпур абярнуўся для самога філантропа саванам, а для яго кніг — больш як паўстагоддзем забароны, выкрэслівання і недапушчэння. Заставаліся толькі згаданыя ўжо ініцыяцыі — ад пакалення да пакалення, ад бацькі да сына.

*Як у халодную ваду,*
*паволі ў Крывію заходжу, —*

піша сучасны паэт. «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» ёсць своеасаблівымі ўводзінамі ў Крывію. Натуральна, што перш за ўсё гэта навуковы каталог і апісанне старабеларускіх рукапісаў і друкаў, аднак у той жа час гэта і хрэстаматыя даўніх тэкстаў, галерэя ўзораў старасвецкага пісьма, крыўскі «глобус Беларусі», па якім можна арыентавацца ў геаграфіі і генеалогіі ліцвінскіх князёў, збор аўтарскіх ацэнак і рэмарак, па якіх, як па скарынаўскіх глосах, можна зразумець кантэкст. Сёння падобныя кнігі выдаюцца на мелаванай паперы са шматлікімі ілюстрацыямі, аднак паняццe факсімільнага выдання забараняе рэстайлінг, і таму «Крыўская кніга» засталася ў выкананні «Мастацкай літаратуры» амаль такой самай, якой яна выйшла 87 гадоў таму ў ковенскай друкарні, з выдатнай вокладкай Мсціслава Дабужынскага, які вельмі дакладна адчуў дух гэтай кнігі. Яна сапраўды выглядала як артэфакт, напрастольнае Евангелле беларушчыны, чым урэшце і стала (магчыма, да таго не імкнучыся).

Сёння «Крыўская кніга» крыху засланяецца прыгожымі энцыклапедычнымі выданнямі Нямiроўскага, Нікалаева, дапаўняецца вучонымі ў манаграфічных працах, але і дзясяткі сучасных навукоўцаў не-не ды і пагартаюць фаліянт самавука без вышэйшай адукацыі, Вацлава Ластоўскага, які вельмі добра паказаў, што можа зрабіць адзін чалавек.

Цяпер сустракацца з Ластоўскім стала прасцей. Хаця сапраўдныя аматары ўсё роўна не перастануць паляваць на арыгінал 1926 года. Таемнае жыццё кнігі працягваецца.

**Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ**

Даты | Падзеі | Людзі



**980** год — у «Аповесці мінулых гадоў» упершыню згадваецца горад Тураў і Тураўскае княства на чале з легендарным правадыром дрыгавічоў князем Турам («от него и туровци прозвашася»). У канцы 1-га тысячагоддзя гэты горад стаў палітычным, эканамічным і культурна-рэлігійным цэнтрам Тураўскага княства. Гарадзішча старажытнага Турава размешчана на мысе пры ўпадзенні р. Язда ў Струмень (пратокі Прыпяці), умацавана равамі і валамі. Пры археалагічных раскопках выяўлены рэшткі наземнага драўлянага жылля і гаспадарчых пабудоў зрубнай канструкцыі з глінабітнымі і цаглянымі печамі, рэшткі шкляных бранзалетаў і посуду, касцяных вырабаў, наканечнікі стрэл і дзіды, нажы, крэсіва і іншае. Матэрыялы раскопак сведчаць аб тым, што старажытны Тураў меў шырокія гандлёвыя сувязі з Кіевам, паўночным Прычарнамор'ем, Блізкім Усходам, Сярэдняй Азіяй, Прыбалтыкай і Валынню, быў адным з найважнейшых культурна-рамесных цэнтраў Старажытнай Русі, дзе развівалася жалезапераапрацоўчае, ювелірнае, кастарэзнае, дрэваапрацоўчае, шавецкае і ганчарнае рамёствы.

**1847** год — нарадзіўся Мікалай Ягоравіч Жукоўскі — «бацька рускай авіяцыі», заснавальнік сучаснай гідра- і аэрамеханікі. У 1902 годзе пад яго кіраўніцтвам была збудавана адна з першых у свеце аэрадынамічных труб, а ў 1904-м — створаны першы ў Еўропе аэрадынамічны інстытут. Яшчэ ў 1898 годзе ў сваёй прамове «Аб паветраплаванні» ён прадказваў: «Чалавек не мае крылаў і ў адносінах вагі свайго цела да вагі мускулаў у 72 разы слабейшы за птушку. Але я думаю, што ён паляціць, абапіраючыся не на сілу сваіх мускулаў, а на сілу свайго розуму».

**1943** год — нарадзіўся Юрый Васільевіч Гаўрын, беларускі мастак. Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і жывапісу. Выканаў вітражы для Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, кінатэатра «Цэнтральны» ў Мінску. Аўтар карцін «Аўтапартрэт», «Батлейка», «Памяці Максіма Багдановіча» і іншых.

Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ: (1913-2002), паэт, празаік, перакладчык, публіцыст, крытык:**

*«Нядоўгі век. І той пражыць не ўмеем:*
*То крыўда раз'яднае, то мана».*



Віншую з днём нараджэння **свата Міхаіла Аляксеевіча**. Жадаю быць здаровым, цеплыні і ўтульнасці хатняй, жыццёвай дарогі гладкай, у сям'і разумення, шчасця, дабрабыту.

**Сваццяя Тамара Мікалаеўна.**

**АДКАЗЫ: па гарызанталі:** 1. Харугва. 5. Галубка. 8. Цар. 9. Мяснік. 10. Управа. 12. Свіслач. 15. Ігнат. 16. Пекла. 19. Колер. 20. Мароз. 23. Апека. 24. Арэол. 29. Лукішкі. 31. Адозва. 32. Марабу. 33. Бой. 34. Кляштар. 35. Маскаль. **Па вертыкалі:** 1. Хамуціус. 2. Рыса. 3. Вакса. 4. Такса. 6. Анучы. 7. Брат. 11. Адвага. 13. Пагалоскі. 14. Пецярбург. 17. Народ. 18. Сымон. 21. Праўда. 22. Беларусь. 25. Слава. 26. Віхор. 27. Німфа. 28. Воля. 30. Рана.

### Кастусь Каліноўскі. Да 175-годдзя з дня нараджэння нацыянальнага героя Беларусі і 150-годдзя пачатку паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.




**Па гарызанталі:** 1. У ВКЛ і ў старажытнай Русі назва баявога вайсковага сцяга. 5. «Марыська чарнаброва, ... мая !». З верша, які К. Каліноўскі напісаў з турмы на волю сваёй нарачонай Марылі Ямант: пад Марыськай ён разумеў Беларусь, беларускі народ. 8. У сваім стане і прыстаў ... (прык.). 9. Мянушка, якую даў душыцелю паўстання 1863—1864 гг. Мураўёву вялікі рускі крытык, пісьменнік, рэвалюцыянер-дэмакрат М. Чарнышэўскі ў сваім рамане «Пралог». 10. У царскай Расіі назва некаторых мясцовых устаноў. 12. Гарадскі пасёлак, раённы цэнтр на Гродзеншчыне, дзе вучыўся ў гімназіі К.Каліноўскі; там жа ўстаноўлены яму помнік. 15. ... Вітажэнец. Імя, пад якім скрываўся ад царскіх жандараў К. Каліноўскі ў Вільні, у Святаянскіх мурах. 16. Адвагаю і ... пяройдзеш (прык.). 19. Светлавы тон чаго-небудзь; афарбоўка. 20. Каб на хмель не ..., дык ён бы тын перарос (прык.). 23. Клопаты, нагляд. 24. Гонар, пашана вакол каго-небудзь (высок.). 29. Гандлёвая плошча ў Вільні, на якой быў пакараны смерцю змагар за лепшую долю беларускага народа Кастусь Каліноўскі. 31. ... (або зварот) К. Каліноўскага з заклікам да беларускага народа пад назвай «Пісьмы з-пад шыбеніцы». 32. Трапічная птушка сямейства буслоў. 33. ... адвагу любіць (прык.). 34. Каталіцкі манастыр. 35. Характэрны гратэскны персанаж у публіцыстыцы К. Каліноўскага і ў сатырычным вершы «Сваякі» Я. Купалы.

**Па вертыкалі:** 1. Адзін з псеўданімаў К. Каліноўскага, а таксама назва паэмы А. Куляшова, якую паэт прысвяціў К. Каліноўскаму. 2. Адметная адзнака, уласцівасць. 3. Мазь для чысткі абутку. 4. Норма аплаты чаго-небудзь. 6. «І хоць мароз крапіць пякучы,\\Да ног даходзіць скрозь ...\\І снегам вочы зашывае,-\\Мужык жыве і не шманае». З паэмы «Новая зямля» («На рэчцы») Я. Коласа. 7. Войт і кат — адзін аднаму ... (прык.). 11. ... гарады бярэ (прык.). 13. «На Беларусі\\Па вёсках ідуць ... -\\З'явіўся Кастусь Каліноўскі». З балады «Кастусь Каліноўскі» П. Броўкі. 14. Расійскі горад, у якім К. Каліноўскі скончыў універсітэт з навуковай ступенню кандыдата права. 17. «Не ... для ўрада, а ўрад для народа». Выказванне К. Каліноўскага. 18. Імя бацькі Кастуся, беззямельнага шляхціца, з шляхецкага роду герба «Калінава». 21. «Мужыцкая ...». Першая ў гісторыі Беларусі газета на беларускай мове, якую выдаваў К. Каліноўскі са сваімі паплечнікамі . 22. «Каго любіш? — Люблю ... . — Так узаемна». Пароль паўстанцаў 1863 года. 25. Добрая ... даражэйшая за багацце (прык.). 26. «Зіма. На дварэ мяцеліца вее,\\Халодныя песні заводзіць ...». З верша «Праз вайну» Я. Купалы. 27. У грэчаскай міфалогіі бажаство ў выглядзе жанчыны. 28. Хоць спіна гола, але свая ...(прык.). 30. «Варты лепшага ў свеце кахання,\\... скончыўшы мужны палёт,\\Русы хлопец золкім світаннем\\На высокі ўзышоў эшафот». З верша «Нявесце Каліноўскага» Ул. Караткевіча.

**Лявон ЦЕЛЕШ.** *г. Дзяржынск.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.18 | 17.22 | 8.04 |
| Віцебск — | 9.14 | 17.06 | 7.52 |
| Магілёў — | 9.08 | 17.12 | 8.04 |
| Гомель — | 8.57 | 17.16 | 8.19 |
| Гродна — | 9.32 | 17.39 | 8.07 |
| Брэст — | 9.25 | 17.47 | 8.22 |

**Месяц**

***Першая квадра 19 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Апанаса, Архіпа, Арцёма, Карпа, Клімента, Лукі, Марка, Ніканора, Прохара, Радзівона, Сцяпана.* ***К.*** *Антаніны, Антона, Генрыха, Мар'яна, Расціслава, Юльяна, Яна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Дзядзечка! Купіце елку!

— Хлопчык, я ўсё разумею, але ж Новы год прайшоў!

— А мама сказала, што новы год толькі пачаўся...

**Як палюбоўнік прыязджаў — бачылі ўсе! А як зладзеі лезлі — дык усе спалі!!!**

Перад наведваннем бацькоўскага сходу, сын:

— Мама — галоўнае нікому там не вер!

**Пасля таго як адключыўся інтэрнэт, са здзіўленнем знайшоў дома жонку, дзяцей і тэлевізар.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 25.903. Індэкс 63850. Зак. № 308.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 студзеня 2013 года.